# ЛІДСКІ ПАРНАС

## 175 партрэтаў лідскіх літаратараў

**Творчасць - гэта Божы дар,**
**Ад зямлі да зор імкненне.**
**І кожны творца мае твар,**
**Як водбліск Божага тварэння.**

pawet.net




**Помнік Францішку Скарыну ў Лідзе, устаноўлены 25 ліпеня 1993 года.**
***Бронза, граніт. Скульптар Валяр'ян Янушкевіч.***
*Здымак Станіслава Судніка, 2025 г.*

ДУ “Лідскі гісторыка-мастацкі музей”

# ЛІДСКІ ПАРНАС

## 175 партрэтаў лідскіх літаратараў

Ліда
“Пружмень”
2025

***Укладальнік Станіслаў Суднік***

***Кансультанты:***
***Галіна Курбыка***
***Леанід Лаўрэш***
***Алесь Хітрун***
***Сяргей Чыгрын***

**ЛІДСКІ ПАРНАС, 175 партрэтаў лідскіх літаратараў.** - Ліда: Лідскі гісторыка-мастацкі музей, ПУП "Пружмень", 2025. - 10 с.: CLXXV іл.

Рэдактар: Алесь Хітрун.
Карэктары: Ірэна Клімовіч, Алесь Хітрун.
Мастак-фотарэстаўратар: Алена Несцерава.

Гэты альбом - кароткі ілюстраваны даведнік пра літаратуру і літаратараў Лідчыны (Лідскіх паветаў розных часоў і Лідскага раёна). Альбом сабраны ў рамках падрыхтоўкі да ўрачыстасцяў XXXII Дня беларускага пісьменства.

© Афармленне. ПУП “Пружмень”, 2025

# Літаратурны чын Лідчыны

Лідчына - край паэтычны. У гэтым можна ўпэўніцца праз творы, якія ў розныя часы былі надрукаваны і з'яўляюцца яркім увасабленнем мінулага і сучаснага, бо праз іх і па сённяшні дзень мы адкрываем старонкі гісторыі. Лідскі край - гэта прастора дзеячоў культуры, якія сваімі зычнымі спевамі, яркімі фарбамі і мілагучнымі паэтычнымі радкамі адлюстроўваюць любоў да сваёй радзімы. Так, прынёманскі горад стаў натхняльнікам для артыстаў, мастакоў, паэтаў! Іх дзейнасць вядома і за межамі Беларусі, што спрыяе пашырэнню сферы турызму.

Так склалася, што элітныя літаратурныя колы нашай краіны не прыдавалі ўвагі талентам Лідчыны. А ў гэтым плане яна багатая! І нарэшце было вырашана, што ў 2025 годзе Дзень беларускага пісьменства пад нумарам XXXII пройдзе ў Лідзе. Абысці лідскі рэгіён, як разумеем, не атрымалася! Так склалася, што Лідчына не стала радзімай лаўрэата Нобелеўскай прэміі па літаратуры, што адсюль не выйшаў у свет Народны паэт або пісьменнік. Хтосьці можа сказаць, што вядомасць лідскіх літаратурных талентаў не расхвалена, што яны раз'ехаліся па ўсім свеце і іх ужо не звязваюць з Лідчынай, аддаюць іншым краям і народам. І той чалавек будзе мець рацыю. Але мы ведаем іх усіх, ведаем, як яны сумавалі і сумуюць па роднай зямельцы, як вазіў з сабой дзесяцігоддзямі песні, запісаныя на Лідчыне, Земавіт Фядэцкі, каб потым выдаць кніжку "Цёплыя вечары... ды халодныя ранкі...", якую ў Італіі назавуць "песнямі Атлантыды"; як выехаўшы з Беларусі Аляксандр Юрэвіч стаў "песняром Крэсаў" і напісаў кнігу "Ліда" і як Юзаф Кардаш напісаў у Польшчы кнігу "Ліда праўдзівая"; як доктар гебілітаваны, карэнная лідзянка Ірэна Стасевіч-Ясюкова заснавала кніжную серыю пра знакамітых лідзян, а недзе ў глыбіні Расіі ўнук святара Савіцкага з Мураванкі Аляксандр Чудакоў апісвае Мураванку і Малое Мажэйкава ў кнізе "Кладзецца імгла на старыя прыступкі", якая ў 2011 г. атрымала прэмію "Рускі Букер дзесяцігоддзя", і г.д.

Бясспрэчна, пра Лідскі край, у якім развіваецца літаратурны працэс, ужо вялася размова на старонках перыядычных выданняў. А ў Доме Валянціна Таўлая збіраюцца і захоўваюцца кнігі і матэрыялы пра мясцовых літаратараў. Там жа праходзяць сустрэчы з лідскімі пісьменнікамі і з тымі, якія вядомыя ў нашай краіне і за яе межамі. Супрацоўнікі Лідскага гісторыка-мастацкага музея вывучаюць свой край і такім чынам знаходзяць цікавыя факты з жыцця таго ці іншага майстра прыгожага пісьменства. Даследуючы тэрыторыю, мы даведваемся, што ў свой час тут спыняліся масцітыя творцы: Янка Купала, Якуб Колас, Максім Гарэцкі, Кандрат Крапіва, Васіль Быкаў, Янка Брыль, Уладзімір Караткевіч, Алесь Ставер, Пятрусь Броўка, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Ніл Гілевіч ...

Не даўшы Нобелеўскіх лаўрэатаў і Народных творцаў Лідчына спарадзіла, узгадавала або на доўгія гады прытуліла вялікую колькасць літаратараў-белетрыстаў, літаратараў-краязнаўцаў і літаратуразнаўцаў, аўтараў навукова-папулярных і публіцыстычных твораў. Мясцовыя краязнаўцы могуць назваць не адну сотню імёнаў. Калі ўзяць толькі літаратараў-белетрыстаў, то гэта:

- паэт-лацініст Міхал Карыцкі з Дзітрыкаў каля Фалькавіч, узнагароджаны паводле ўказу караля Станіслава Аўгуста медалём "Merentibus" ("Заслужаны");
- графіня Сафія дэ Шуазёль Гуф'е (з дому Тызенгаўз), фрэйліна дзвюх імператрыц, аўтарка пяці гістарычных раманаў, напісаных па-французску, але на беларускую тэматыку;
- Вільгель Пратасевіч, аўтар школы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Яго "Суседчык гавейскі", напісаны на архаічнай беларускай мове, стаіць у адным шэрагу з паэмай "Тарас на Парнасе";
- Вера Навіцкая, начальніца Лідскай жаночай гімназіі імя Марыі Навіцкай, аўтарка шэрагу аповесцей для дзяцей і пра дзяцей, у тым ліку тэтралогіі пра Марусю Старабельскую, дзе скарыстаны сюжэты з жыцця менавіта лідскіх гімназістак;

- адна з пачынальніц новай беларускай літаратуры Алаіза Пашкевіч (Цётка), якую цяпер прывыклі называць "шчучынкай", нарадзілася на гістарычнай Лідчыне, яе бацька, мяркуецца, пахаваны на лідскіх каталіцкіх могілках;

- нарадзіўся ў Радуні Лідскага павета і быў ахрышчаны ў лідскім Свята-Міхайлаўскім саборы геніяльны паэт і перакладчык Пятро Бітэль;

- закончыў Лідскую гімназію, жыў і пісаў у Баневе каля Дакудава Генеральны сакратар Саюза пісьменнікаў Польскай Народнай Рэспублікі Ежы Путрамант, у яго творах - шырокая панарама лідскага жыцця;

- у Лідзе жыў, працаваў і пакутаваў заходнебеларускі паэт-змагар Валянцін Таўлай;

- у Лідскім жа павеце знаходзілася і "гняздо" заходнебеларускіх паэтаў Герасіма Праменя, Васіля Струменя і Петруся Граніта - вёска Зачэпічы, якая сёння ў Дзятлаўскім раёне;

- у Лідскім раёне знаходзіцца вёска Біскупцы, дзе ў 19-м стагоддзі жыў і пісаў сват Адама Міцкевіча Антоні Гарэцкі, а ў 20-м стагоддзі нарадзілася геніяльная паэтэса і пісьменніца Данута Бічэль (Бічэль-Загнетава), а таксама самадзейная паэтка Ганаэфа Міхаловіч;

- на хутары Хадзюкі каля Тарнова нарадзілася аўтарка некалькіх зборнікаў паэзіі, дырэктар каталіцкага выдавецтва "Про Хрыста" Крысціна Лялько, узнагароджаная за сваю працу медалём "Benemerenti" ("Асабліва заслужаным") ад Папы Рымскага Бенедыкта XVI;

- у Лідзе нарадзілася аўтарка некалькіх зборнікаў паэзіі і аўтар шматлікіх прац па гісторыі беларускай літаратуры, у свой час намеснік старшыні Сусветнай арганізацыі беларусістаў, кандыдат філалагічных навук Ірына Багдановіч;

- з вёскі Дамейкі Лідскага раёна паходзіць кандыдат філалагічных навук, аўтар некалькіх зборнікаў паэзіі Юрась Пацюпа;

- у Лідзе нарадзіўся майстар дэтэктыўнага жанру, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Віктар Праўдзін;

- большую частку жыцця пражыў у Лідзе і прадаўжае тут жыць паэт і празаік Уладзімір Васько, і г.д., і г.д.

І дзясяткі, і сотні імёнаў, якія яшчэ раз сцвярджаюць, што Лідчына - літаратурны край!

У гэты альбом сабраны 182 партрэты лідскіх літаратараў з кароткімі анатацыямі. Гэта далёка не ўсе партрэты, тым больш не ўсе літаратары. Але каб паказаць партрэт, трэба мець больш-менш прыстойную фатаграфію або рэпрадукцыю. Каб атрымаць партрэты з зусім неякасных фатаграфій або і з апісання на словах, давялося папрацаваць мастакам Вадзіму Вераб'ёву і Алене Несцеравай, якія выканалі гэтую вельмі важную працу.

Таму, шаноўныя аматары літаратуры, паўглядайцеся ў прыгожыя, сур'ёзныя, разумныя твары лідскіх паэтаў і пісьменнікаў і паспрабуйце адказаць на пытанні: "А можа, Лідчына - не такі ўжо занядбаны ў літаратурным плане край? Можа, ёсць у Лідзе што пачытаць, што паслухаць?"

А пачытаць, насамрэч, ёсць што. Толькі ў анатацыях альбома пералічаны некалькі соцень кніг, выдадзеных лідскімі літаратарамі. Некалі ў Лідзе будуць выдадзены і "Лідскі літаратурны слоўнік", і "Лідская хрэстаматыя". А пакуль чытайце лідскі літаратурна-мастацкі зборнік "Ад лідскіх муроў" (выйшла 11 выпускаў).

Паслухаць лідскіх літаратараў можна на штомесячных паседжаннях літаб'яднання "Суквецце" пры рэдакцыі "Лідскай газеты" і на “Замкавым гасцінцы”.

А яшчэ наведайце літаратурны філіял Лідскага гісторыка-мастацкага музея - Дом Валянціна Таўлая.

Там вы знойдзеце і гэты альбом.

Партрэты ў альбоме размешчаны ў адпаведнасці з датамі нараджэння літаратараў - ад старэйшых да малодшых.

*Станіслаў Суднік.*




**Ян Карцан**

**(? - 1611 гг.)**

**Беларускі першадрукар 2-й генерацыі. З Вялічак каля Мінойтаў Лідскага павета. З 1580 па 1611 г. з друкарні Яна Карцана выйшла 101 вядомае выданне.**

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Вадзім Вераб'ёў. 2013 г.*



**Міхал Карыцкі**

**(4 верасня 1714 - 10 сакавіка 1781)**

**Паэт-лаціціст. З Дзітрыкаў каля Фалькавічаў Лідскага павета. Езуіт. Пісаў панегірыкі, элегіі і эпіграмы. Пасмяротна выйшаў зборнік яго твораў "Песні". Паводле ўказу караля Станіслава Аўгуста М. Карыцкі быў узнагароджаны медалём "Merentibus" ("Заслужаны"). Памёр у Мінску.**

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Алена Несцерава.*



# Мацей Догель

**(6 жніўня 1715 - 24 лютага 1760)**

**Гісторык-археограф, правазнавец ВКЛ, выкладчык, выдавец. Нарадзіўся ў Гембулах Лідскага павета. Скончыў Шчучынскую піярскую школу. Уступіў у ордэн піяраў і займаўся выкладаннем. Выдаў збор міжнародных трактатаў “Дыпламатычны кодэкс Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага” (лац. “Codex diplomaticus Regni Poloniae et Magni Ducatus Lituaniae” і інш. Адзін з асноўных артыкулаў - “Ліцвіны”.**

*Мастак А. Маўрын, 1850 г.*



# Казімір Даніэль Нарбут

**(3 студзеня 1738 - 17 сакавіка 1807)**

**Нарадзіўся ў Крупе (Крупаве) Лідскага павета. Вучыўся ў Рыме; ксёндз, абат парадыскі, прафесар піярскага калегіюма, прафесар Collegium Nobilium у Вільні. Член Адукацыйнай камісіі. Аўтар першага ў ВКЛ падручніка логікі (Вільня 1769 г.). За заслугі атрымаў у 1793 г. ад караля Станіслава Аўгуста ордэн св. Станіслава. У вольны час пісаў вершы. У канцы жыцця вярнуўся на Лідчыну, дзе жыў у маёнтку Радзівонішкі свайго брата Дамініка, тут памёр і пахаваны.**



## Станіслаў Баніфацы Юндзіл

**(6 мая 1761 - 15 красавіка 1847)**

**Батанік, заолаг і прыродазнавец, адзін з першых даследчыкаў расліннага і жывёльнага свету Беларусі, доктар філасофіі і тэалогіі (1798), прафесар батанікі і заалогіі Віленскага ўніверсітэта, загадчык кафедры гісторыі прыроды. Нарадзіўся ў в. Ясенцы, Лідскага павета. Пачатковую адукацыю атрымаў у бацькоўскім доме. Затым скочыў тры першыя класы ў піярскім калегіюме ў Лідзе. Найбольш значная праца - "Апісанне літоўскіх раслін паводле сістэмы Лінея". Пад псеўданімам Ваўрынец Кастрыца выдаваў сатырычны часопіс "Bibliafobia". Пакінуў мемуары - каштоўную крыніцу з гісторыі Віленскага ўніверсітэта і культурнага жыцця ВКЛ.**

*Мастак Ян Рустэм, 1850 г.*



## Аляксандра Нарбут (па мужу Цясельская)

**(1767? - 1803)**

**Акадэмік Прускай акадэміі навук у вобласці літаратуры (19.01.1788), пісьменніца, перакладчыца, драматург, актрыса. Нарадзілася ў Сукурчах каля Крупава ў сям'і Тадэвуша Нарбута, падкаморага Лідскага павета. Выхоўвалася пры двары князёў Чартарыскіх у Пулавах. У 1793 г. у Варшаве асобнай кнігай выйшаў зроблены ёй у 1790 г. пераклад п'есы дэ Жанліс "Зэлія, альбо шчырасць". Памерла ў Самакленках (Польшча).**

*Ілюстрацыя да паэмы Францішка Князьніна "Паветраны шар, ці пулаўскія вечары". Аляксандра Нарбут у ролі Кліадоры. Партрэт згенерыраваны нейрасеткай па замове Алены Несцеравай.*



## Графіня Ганна Патоцкая
## (з дому Скумін-Тышкевіч)

**(26 сакавіка 1779 - 16 жніўня 1867)**

**Нарадзілася ў Варшаве. Пасля смерці бацькоў на Лідчыне Ганне Патоцкай належалі Радуньскае, Эйшышскае, Васілішскае, Каняўскае і Дубіскае староствы. Аўтар мемуараў і падарожных запісак "Voyage en Italie" ("Падарожжа ў Італію"), якія былі выдадзены асобнымі кнігамі. Пісала па-французску. Памерла ў Парыжы.**

*Мініяцюра Вінцэнта Лесарэ.*



## Тэадор Остык Нарбут герба Трубы

**(8 лістапада 1784 - 26 лістапада 1864)**

**Нарадзіўся ў Шаўрах Лідскага павета. Выхоўваўся ў Лідскай піярскай школе, а ў 1799 г. паступіў на матэматычна-інжынерны факультэт Віленскага ўніверсітэта, які скончыў у 1803 г. Служыў вайсковым інжынерам, потым займаўся гісторыяй, аўтар 9-ці томнай “Гісторыі літоўскага народа”. Пісаў вершы. Некаторыя па-беларуску апублікаваны ў зборніку “Ад лідскіх мuроў” № 11. Пераклаў на польскую мову раман Сервантэса “Дон Кіхот” (неапублікаваны). Памёр у Вільні.**

*Фотаатэлье Фаянса ў Варшаве.*



## Антоні Гарэцкі

**(1787 - 18 верасня 1861)**

**Паэт, байкапісец, удзельнік напалеонаўскіх войнаў і паўстання 1831 г. Нарадзіўся ў Вільні жыў і тварыў на Віленшчыне і Лідчыне ў сваім маёнтку Біскупцы. Пасля вучобы ў хатніх настаўнікаў у 1802 г. паступіў на філалагічны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1805 г. стаў відочным літаратурны талент Гарэцкага. Дэбютам стаў яго пераклад першай элегіі Тыбула, надрукаваны ў “Дзённіку Віленскім”. Выдаў кнігі “Паэзія ліцвіна”, “Сяўба” і інш. Сват Адама Міцкевіча. Памёр і пахаваны ў Парыжы.**



# Графіня Сафія дэ Шуазёль Гуф'е (з дому Тызенгаўз)

**(1790-1878)**

**Нарадзілася ў мястэчку Жалудок Лідскага павета. Фрэйліна дзвюх рускіх імператрыц, аўтарка шэрагу гістарычных раманаў, мемуарыстка. Пісала на французскай мове. Пакінула каштоўныя ўспаміны пра часы царавання Аляксандра I, вайну 1812 года і замежныя паходы рускай арміі ў 1813-1814 гг.**




# Ігнат Дамейка

**(31 ліпеня 1802 - 23 студзеня 1889)**

**Філамат, удзельнік паўстання 1830 - 1831 гадоў, беларускі і чылійскі навуковец-даследнік, геолаг, мінеролаг, рэктар Чылійскага ўніверсітэта, Нацыянальны герой Чылі.**

**Нарадзіўся ў маёнтку Мядзведка Навагрудскага павета. З 1812 г. навучаўся ў школе ордэна піяраў у Шчучыне Лідскага павета. Па сканчэнні школы ў 1816 годзе паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Па выраку суда ў справе філаматаў з 1824 г. жыў у м. Заполле на Лідчыне. Напісаў сярод іншых кнігі "Араўканія і яе жыхары", "Мае падарожжы. Успаміны выгнанца". Памёр і пахаваны ў Сант'яга дэ Чылі.**

*Медаль у гонар І. Дамейкі, выбіты ў Чылі ў 1885 г.*



## Каміла Юрэвіч з Нарбутаў

( ~1805 ці 1814/1815 - 1881)

**Пісьменніца, супрацоўнічала з “Дзённікам Віленскім”.**
**Нарадзілася ў Юршышках Лідскага павета. У 1835 г. выдала аповесць “Мечыслаў і Стэфанія” і “Маральныя лісты” (“Pisma moralne”), у 1852 г. - “Калядкі Камілы Нарбут ...” і ў 1862 г. “Літоўскія замалёўкі”.**
**Пасля смерці бацькі, яна стала ўладальніцай маёнтка Юршышкі і выйшла замуж за Юрэвіча. Першыя дзве кнігі выйшлі пад прозвішчам Нарбут, наступныя пад прозвішчам Юрэвіч. Памерла ў Юршышках.**

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Алена Несцерава.*



## Мірон Браніслаў Нарбут

**(1822 - пасля 1880)**

**Нарадзіўся ў м. Варонічы ці Нікадзімава Лідскага павета. Аўтар каштоўных мемуараў. Пасля заканчэння 5-класнай павятовай вучэльні ў Лідзе працаваў тут жа ў канцылярыі павятовага маршалка. У 1863 г. узяў удзел у паўстанні і быў сасланы ў Арэнбургскую губерню, дзе і пісаў свае мемуары. Праз нейкі час пасля амністыі вярнуўся ў родны край, дзе і памёр, жывучы ў сваякоў. Быў жанаты з Канстанцыяй Марачэўскай і пакінуў нашчадкаў.**



## Канстанцін Кашыц

**(1828 - 1881)**

**Кандыдат дыпламатычных навук, стваральнік рыфмованых сатыр, якія друкаваў пад псеўданімамі Загадка, Крыжык, Дагератып, Пастка. Валодаў велізарным маёнткам Тарноўшчына (Тарнова) ў Лідскім павеце, удзельнічаў у паўстанні 1863 года, адбываў высылку, страціў значную частку зямель.**



## Альжбета Табенская

**(каля 1830 - пасля 1897)**

**Нарадзілася ў в. Рудаў Лідскага павета. Настаўніца. Закончыла пансіён у Вільні. Адкрыла першую прыватную жаночую школу ў Лідзе ў 1861 г. Удзельніца паўстання 1863-64 гг. У 1864 саслана ў Сібір на пасяленне. Адбывала ссылку ў Томскай і Енісейскай губернях. Служыла гувернанткай у польскіх і расійскіх дамах. В 1876 г. вярнулася на радзіму. Аўтар мемуараў “Z doli i niewoli. Wspomnienia wygnanki” (Krakow, 1897). Па-беларуску мемуары надрукаваны ў часопісе “Лідскі летапісец”.**

*Апрацавала фота мастак Алена Несцерава.*



**Вільгельм Пратасевіч**

**(? 1830 - ? 1900)**

**Паэт школы Дуніна-Марцінкевіча.**

**Аўтар паэмы “Суседчык гавейскі” пра паляванне на лідскім беразе рэчкі Гаўя, першага твора на архаічнай беларускай мове, напісанага на Лідчыне. Дата напісання паэмы каля 1858 года.**

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Алена Несцерава.*



# Апалонія Серакоўская з Далеўскіх

**(19 студзеня 1838 - 2 студзеня 1919)**

**Нарадзілася ў фальв. Кункулка Лідскага павета. У 1848 годзе сям'я Далеўскіх пераехала ў Вільню. Скончыла пансіён. Пазней Апалонія наведвала курсы, арганізаваныя Шляхецкім Інстытутам. Улетку 1861 года пазнаёмілася з капітанам расійскай арміі Зыгмунтам Серакоўскім. Пара ажанілася ў Кейданах 30 ліпеня 1862 г. Пасля смерці мужа ў 1863 г. была саслана ў глыб Расіі. Вярнулася з высылкі ў 1868 г. Жыла і памерла ў Варшаве. Напісала ўспаміны. На беларускай мове апублікаваны ў газеце "Наша слова".**



**Тэадора Манчунская з Нарбутаў**

**(каля 1839 - 27 сакавіка 1925)**

**Нарадзілася ў фальв. Шаўры Лідскага павета. Дачка Тэадора Нарбута. Удзельніца паўстання 1863 г. Пісала вершы (не апублікаваныя). Напісала невялікія ўспаміны. Апрацавала архіў сям'і Нарбутаў, суправаджаючы сваімі каментарамі. 2 мая 1924 г. была ўзнагароджана Кавалерскім Крыжам ордэна Адраджэння Польшчы. Памерла ў Кракаве.**

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Алена Несцерава.*



## Аляксандр Дамбавецкі

**(1840 - пасля 1914)**

**Беларускі краязнавец, грамадскі і палітычны дзеяч. Уладальнік маёнтка Бердаўка з сярэдзіны 60-х гадоў XIX ст. да 1914 года. Міравы суддзя Лідскай судова-міравой акругі, Магілёўскі губернатар, сенатар Расійскай імперыі, краязнавец, рэдактар калектыўнай працы “Спроба апісання Магілёўскай губерні ў гістарычных, фізіка-геаграфічных, этнаграфічных прамысловых, сельскагаспадарчых, лясных, вучэбных, медыцынскіх і статыстычных адносінах” (кн. 1-3, 1882-1884).**



## Вандалін Шукевіч

**(10 снежня 1852 - 1 снежня 1919)**

**Беларускі археолаг і этнограф, член-карэспандэнт Кракаўскай акадэміі ведаў (1901). Член Віленскага таварыства сяброў навукі (1907). Нарадзіўся ў фальв. Нача Лідскага павета. Аўтар такіх гістарычных прац, як "Каменныя курганы ў Лідскім павеце", "Двары, замкі, палацы", "Старажытныя каралеўскія лясы ў Літве", "Нарысы аб Белай Русі", "Народныя вераванні і абрады (забабоны, прымхі, прадказанні і інш.), сабраныя ў Віленскай губерні", "Некаторыя вераванні, прымхі і забабоны нашага народа, легенды і паданні", "Старажытныя лекавыя сродкі" і інш. Памёр і пахаваны ў Начы ў радавой капліцы.**



## Кіпрыян Кандратовіч

**(5 мая 1859 - 31 кастрычніка 1932) ,**

**Нарадзіўся ў в. Зіновічы каля Ваверкі ў Лідскім павеце. Расійскі вайсковы дзеяч, генерал ад інфантэрыі Удзельнік руска-турэцкай, руска-японскай і Першай сусветнай вайны. Адзін з аўтараў кнігі “Плеўна і грэнадзёры 28 лістапада 1877 г.”. Пісаў у газету “Московские ведомости” (1884-1900) і ў беларускую газету “Наш Сьцяг” (1923), пакінуў успаміны (не апублікаваныя). Памёр у сваім маёнтку Гародна Лідскага павета. Быў пахаваны каля лідскай Свята-Георгіеўскай царквы. У 90-я гады XX ст. магіла перанесена ў Воранава.**



**Амелія Даравінская (Дзеравінская), “Бірута”**

**(1863 - 27 ліпеня 1891)**

**Працавала настаўніцай у Лідзе. Надрукавала ў часопісе “Wisla” артыкул “Дажынкі на Літве” (1887), легенду “Сосны ў Лідзе” (1889). Праз год пасля яе заўчаснай смерці ў “Зборніку паведамленняў па айчыннай антрапалогіі” (1892) з'явіліся сабраныя ёй “Беларускія песні з Лідскага павета”.**

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Алена Несцерава.*



# Карусь Каганец

**(10 лютага 1868 - 20 мая 1918)**

**Сапраўднае: Кастравіцкі Казімір Рафаіл Карлавіч.**
**Нарадзіўся ў Табольску, працаваў дзясятнікам у Лідзе на будаўніцтве чыгункі Балагое-Сядлец у 1905 г., сям'я жыла ў Лідзе да 1906 г. Грамадскі дзеяч, беларускі паэт, празаік, драматург, дзіцячы пісьменнік, аўтар першых беларускіх падручнікаў, перакладчык, навуковец-мовазнавец, фальклярыст, мастак і скульптар. Яго вадэвіль "Модны шляхцюк" (1910), карыстаўся вялікай папулярнасцю. Памёр у в. Прымагілле Мінскага павета, цяпер в. Юцкі, Дзяржынскі раён, Мінская вобласць.**



# Уладзіслаў Вярыга

**(9 чэрвеня 1868 - 27 жніўня 1916)**

**Філосаф, этнограф і збіральнік беларускага фальклору. Доктар філасофіі. Нарадзіўся ў Пскове. Як хатні настаўнік паміж 1885 і 1889 гадамі працаваў на Лідчыне. У 1889 г. у Львове Вярыга выдаў кнігу "Беларускія паданні", дзе змясціў 23 беларускія народныя казкі, запісаныя ў 1884 г. у ваколіцах Новага Двара і Астрыны Лідскага павета. У 1889 г. у часопісе "Збор звестак па айчыннай антрапалогіі" Уладзіслаў Вярыга апублікаваў працу "Беларускія думкі з вёскі Глыбокае Лідскага павета Віленскай губерні, запісаныя ў 1885 годзе", якая змяшчае 42 беларускія народныя песні-балады.**



# Амброзі Кастравіцкі

**(1871 - 1937)**

**Брат Каруся Каганца - Амброзі Самуэль Кастравіцкі - нарадзіўся ў Цывінску, што ў Сібіры, падчас вяртання сям'і з ссылкі. Скончыў гімназію ў Пецярбургу і ў 1897 г. - медыцынскае аддзяленне Маскоўскага ўніверсітэта. З 1901 года працаваў у Лідзе. Разам з братам уваходзіў у "Круг беларускай народнай прасветы і культуры". Прафінансаваў выданне першай беларускай кніжкі казак, укладзенай братам. Як вайсковы лекар атрымаў асаду ў Белагрудзе, дзе і памёр.**



**Уладзіслаў Котвіч**

**(20 сакавіка 1872 - 3 кастрычніка 1944)**

**Філолаг-усходазнавец. Нарадзіўся ў в. Восава Лідскага павета. Вучыўся ва ўніверсітэце ў Санкт-Пецярбургу. Удзельнічаў у экспедыцыях у Калмыкію і Манголію. Склаў граматыку калмыцкай мовы (1915). Рэктар Петраградскага інстытута ўсходніх моў (1920-22). У 1924 перабраўся ў Львоў і прыняў кіраўніцтва кафедрай Львоўскага ўніверсітэта. Акадэмік Польскай акадэміі навук (1927).**



## Вера Навіцкая

**(1873? - пасля 1915)**

**З дому Шыльдар-Шульднер. Скончыла Ліцейную жаночую гімназію ў Санкт-Пецярбургу ў 1890 годзе. Пражывала ў Лідзе з 1908 па 1915 г. У жніўні 1908 года яна была прынятая на пасаду памочніцы начальніцы Лідскай жаночай прыватнай шасцікласнай прагімназіі Марыі Канстанцінаўны Навіцкай. З 1909 г. начальніца прагімназіі, а затым гімназіі. Выдала каля дзясятка кніг, у асноўным для дзяцей і пра дзяцей.**

*Ілюстрацыйны партрэт Алены Несцеравай.*



# Алаіза Пашкевіч (Цётка)

**(15 ліпеня 1876 - 18 лютага 1916)**

**Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч (у шлюбе Кайрыс) нарадзілася ў фальв. Пясчына Лідскага павета. Беларуская паэтка, грамадская і палітычныя дзяячка, публіцыстка. Аўтар зборнікаў “Хрэст на свабоду” і “Скрыпка беларуская”, кніг для дзяцей “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, “Лемантар”, “Гасцінец для малых дзяцей” і інш. Памерла і пахавана ў Новым Двары Лідскага павета.**



## Міхал Шымялевіч

**(18 кастрычніка 1879 - 11 студзеня 1969)**

**Гісторык, найбуйнейшы лідскі краязнавец, аўтар мноства артыкулаў пра Лідчыну. Нарадзіўся ў в. Пеляса Лідскага павета. Першую адукацыю атрымаў у Лідскім павятовым вучылішчы. З 1901 г. працаваў у Лідзе. У 1905 - 1908 гадах вучыўся ў Ягелонскім універсітэце ў Кракаве. У 1927 годзе выбіраўся ў Лідскую гарадскую раду ад Таварыства беларускай школы. У 1936 - 1939 гадах быў сябрам рэдакцыйна-выдавецкага камітэта газеты “Ziemia Lidzka”, дзе апублікаваў каля 30-ці краязнаўчых артыкулаў. У 1940 годзе быў вывезены ў Казахстан. Пасля 1948 года жыў у Сопаце, дзе і памёр.**



## Антон Грымайла-Прыбытка

**(1880? - пасля 20 чэрвеня 1941 г.)**

**Сын генерал-маёра рускай арміі Аляксандра Прыбыткі. У 1920-30-х гг. неаднаразова выбіраўся ў Лідскую гарадскую раду, быў лаўнікам Лідскага магістрата і выдатным лідскім краязнаўцам, старшынёй Лідскага краязнаўчага таварыства. У 1936 - 1939 гадах быў сябрам рэдакцыйна-выдавецкага камітэта газеты "Ziemia Lidzka", дзе апублікаваў шэраг краязнаўчых артыкулаў. 20 чэрвеня 1941 г. вывезены ў Мінусінскі край.**

*Партрэт з фатаграфіі. Мастак Вадзім Вераб'ёў.*



## Алена Іваноўская (па мужу Скіндар)

**(3 мая 1885 - 10 мая 1973)**

**Папулярызатар беларускай культуры, перакладчыца. Нарадзілася ў Галавічполі Лідскага павета. Каля 1905 года пачала навучанне ў Ньюнам каледжы Кембрыджскага ўніверсітэта. У 1914 г. змясціла ў лонданскім часопісе “Folk-Lore” (“Фальклор”) тэксты пятнаццаці беларускіх песень з нотамі, запісаных у ваколіцы Лябёдкі. У 1924 годзе змясціла ў тым жа часопісе яшчэ 23 песні. Праведнік народаў свету. Памерла ў Казяніцах Келецкага ваяводства, Польшча.**

*Партрэт апрацавала мастак Алена Несцерава.*



## Каміла Эмілія Макрэцкая, па мужу Лянге

**(1890? - пасля 1926)**

**Дачка расійскага афіцэра і польскага генерала Адама Макрэцкага з Дзітрыкаў каля Фалькавічаў Лідскага павета. У 1920 годзе пераехала за бацькам у Гародню, дзе ў 1926 годзе апублікаывала паэму “Год 1919 або Песня пра дывізіі Літоўска-Беларускія”.**

*Ілюстрацыйны партрэт. Мастак Алена Несцерава.*



**Аляксандр Снежка**

**(1896-1975)**

**Нарадзіўся ў Кейданах (зараз - Летува). Лідскі краязнавец, аўтар шэрагу публікацый у газеце “Ziemia Lidzka”, сябар рэдакцыйна-выдавецкага камітэта гэтай газеты. У 1937 г. як аўтар выдаў кнігу пра касцёл у Міры (“Kosciol farny w Mirze. Szkic monograficzny, 1587-1937”). Пасля вайны жыў у Польшчы, заснавальнік і першы дырэктар Музея пошты і тэлекамунікацый ва Уроцлаве. Гісторык пошты, філатэліст, аўтар 400 публікацый.**

*Партрэт з фатаграфіі. Мастак Вадзім Вераб’ёў.*



**Іосіф Далінскі**

**(1900-1983)**

**Прафесар Маскоўскага Усесаюзнага Інстытута Кінематаграфіі. Нарадзіўся ў Лідзе. Вучыўся ў лідскім хедэры. Некалькі гадоў таму выйшла кніга яго ўспамінаў, у якой ён апісвае сваё дзяцінства ў Лідзе пачатку XX стагоддзя.**



## Графіня Эльжбета Красіцкая

**(1900? - пасля 1942)**

**Родам з Падолля (маёнтак Шабастоўка). Выйшла замуж за графа Алексы Красіцкага, унука Канстанціна Кашыца. З 1921 года з мужам жыла ў маёнтку Вялікае Ольжава. У 1936 годзе выдала кнігу паэзіі "Okruchy" ("Крошкі"). Рэцэнзія на кнігу была надрукавана ў газеце "Ziemia Lidzka".**

*Партрэт з фатаграфіі. Мастак Алена Несцерава.*



# Вітольд Пілецкі

**(13 мая 1901 - 25 мая 1948)**

**Ротмістр Войска Польскага, дзеяч польскага антынямецкага падполля, арганізатар руху супраціву ў канцэнтрацыйным лагеры Асвенцым. Нарадзіўся ў горадзе Аланец, куды яго сям'я была саслана за ўдзел у паўстанні 1863 года. Паходзіў са шляхты ВКЛ герба Ляліва. З 1921 па 1939 год - уладальнік радавога маёнтка Сукурчы каля в. Крупава Лідскага павета. Напісаў паэму “Сукурчы”.**



## Гарасім Прамень (сапр. Іван Пышко)

**(1908 - 7 чэрвеня 1964)**

**Нарадзіўся ў вёсцы Зачэпічы Лідскага павета. Удзельнік беларускага нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1920-1930 гг. Быў сакратаром Зачэпіцкай ячэйкі КПЗБ. Пісаў вершы. Друкавацца пачаў у 1933 годзе. Друкаваўся ў беларускіх і польскіх дэмакратычных газетах. Пасля Другой сусветнай вайны друкаваўся ў Дзятлаўскай раённай газеце. Памёр і пахаваны ў вёсцы Зачэпічы.**



## Уладзіслаў Абрамовіч

**( 9 мая 1909 - 16 лістапада 1965)**

**Рэдактар знакавай для горада Ліды газеты "Ziemia Lidzka", якая выдавалася ў Лідзе з красавіка 1936 г. па жнівень 1939 г., карэспандэнт газеты "Кур'ер Віленскі" ў Лідзе. Пісьменнік, журналіст, гісторык, літаратуразнавец, паэт і перакладчык, аўтар адзінаццаці кніг. Нарадзіўся у Новым Двары каля Трокаў. Загінуў і пахаваны ў Вільні.**



# Пятрусь Граніт (сапр. Іван Івашэвіч)

**(1909-1980)**

**Нарадзіўся ў вёсцы Зачэпічы Лідскага павета. Працаваў брукаром. Удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. Член КПЗБ. Пісаў вершы. Пасля вайны закончыў завочна Навагрудскае педвучылішча, працаваў настаўнікам, дырэктарам пачатковай школы ў Зачэпічах. Выдаў адзіны зборнік вершаў для дзяцей "Сцяжынка" (1978). Памёр і пахаваны ў Зачэпічах.**



# Уладзімір Корбан

**(25.08.1910 - 30.11.1971)**

**Сатырык, баечнік. Член СП СССР з 1948 г., “Заслужаны дзеяч культуры БССР” (1970). Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, “Знак Пашаны” і медалямі. Нарадзіўся ў пас. Барань Аршанскага раёна ў сям’і рабочага. З канца 1946 да студзеня 1948 г. працаваў дырэктарам цвіковага завода ў Лідзе. З 1952 г. працаваў у часопісе “Вожык”, у 1967-71 гг. - яго галоўны рэдактар. Аўтар многіх зборнікаў вершаў, баек і фельетонаў.**



# Ежы Путрамант

**(10 лістапада 1910 - 23 чэрвеня 1986)**

**Нарадзіўся ў Мінску. З 1925 года сям’я жыла ў Лідзе, з 1928 па 1939 - у Баневе каля Дакудава. Закончыў Лідскую гімназію і Віленскі ўніверсітэт. У вайну ўваходзіў у структуры па стварэнні Войска Польскага. Ваяваў у дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі. Аўтар некалькіх кніг вершаў, многіх аповесцяў і раманаў. У першым томе тэтралогіі “Паўвеку” вельмі шмат піша пра Ліду, Дакудава і Банева. Ужываў псеўданім Банеўскі. Генеральны сакратар Саюза пісьменнікаў ПНР. Памёр у Варшаве.**



## Аркадзь Мігдал

**(11 сакавіка 1911 - 9 лютага 1991)**

**Савецкі фізік-тэарэтык. Нарадзіўся ў Беларусі. У Першую сусветную вайну разам з бацькамі ўцёк ад немцаў у Пецярбург. Пасля заканчэння школы паступіў у Ленінградскі ўніверсітэт. У 1943 - 45 гг. А. Б. Мігдал працаваў у Інстытуце фізічных праблем АН СССР, з 1944 г. - прафесар Маскоўскага інжынерна-фізічнага інстытута. У 1945-71 у Інстытуце атамнай энергіі. Член-карэспандэнт АН СССР (1953), акадэмік АН СССР (1966). Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Акрамя навуковых прац, аўтар шэрагу навукова-папулярных артыкулаў. Памёр у Прынстане, ЗША.**



## Якуб Міско

**(1 чэрвеня 1911 - 1983)**

**Празаік, публіцыст, журналіст, паэт, перакладчык, крытык, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіўся ў вёсцы Чамяры на Слонімшчыне. Паплечнік Валянціна Таўлая і Піліпа Пестрака па нацыянальна-вызвольнай барацьбе ў Заходняй Беларусі. У 1940 - 1941 гг. быў літсупрацоўнікам лідскай раённай газеты “Уперад”. Пасля вайны працаваў у мінскіх выданнях. Напісаў сотні артыкулаў. Пасмяротна выйшла яго кніга “Маё маўклівае сэрца” (1983). Памёр і пахаваны ў Мінску.**

*Здымак 1945 года.*



# Пятро Бітэль

**(19 чэрвеня 1912 - 18 кастрычніка 1991)**

**Беларускі святар, паэт і перакладчык. Нарадзіўся ў мястэчку Радунь Лідскага павета. Хрышчаны ў Лідскім Свята-Міхайлаўскім праваслаўным саборы. Скончыў Беларускую Віленскую настаўніцкую семінарыю (1931), Мінскі педінстытут (1970). Аўтар паэм “Замкі і людзі” (1968), “Сказанне пра Апанаса Берасцейскага” (1984). Зрабіў шмат перакладаў з польскай, рускай, украінскай і іншых моў.**

*Мастак А. Бярэзін. Аловак. 2001 г.*



## Валянцін Таўлай

(8 лютага 1914 - 27 красавіка 1947)

Беларускі паэт, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху Заходняй Беларусі, падпольшчык. Нарадзіўся ў Баранавічах у сям'і чыгуначніка. Дзяцінства прайшло ў вёсцы Рудаўка на Слонімшчыне. У 1919 - 1923 гг. вучыўся ў польскай школе ў Лідзе, у той перыяд ён напісаў свой першы верш "Верабейкі" ("Wrobelki", на польскай мове). У 1939-1941 гадах працаваў у лідскай раённай газеце "Уперад". Член Саюза пісьменнікаў БССР з 1941 года. Удзельнік партызанскага руху ў час вайны. Пасля вайны намеснік дырэктара Літаратурнага музея Янкі Купалы. Пахаваны ў Мінску на Вайсковых могілках.



# Васіль Струмень

**сапр. Аляксандр Мікалаевіч Лебедзеў**

**(1 красавіка 1914 - 25 кастрычніка 1992)**

**Нарадзіўся ў вёсцы Лявонцьева Калагрыўскага павета, Кастрамской губерні. З 1920 г. рос у прынёманскай вёсцы Зачэпічы Лідскага павета. Удзельнік нацыянальна-вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі. Член КПЗБ. Пісаў вершы. Напісаў паэму "Забастоўка" пра штрайк у Бярозаўцы. Памёр у горадзе Сарны Ровенскай вобласці (Украіна), дзе і пахаваны.**



# Ніна Тарас

**(15 мая 1916 - 12 снежня 2006)**

**Беларуская паэтэса, перакладчыца. Член Саюза пісьменнікаў СССР (з 1940). Нарадзілася ў в. Заполле, цяпер Навагрудскі раён. Закончыла Віленскую беларускую гімназію (1936). У 1938 годзе пераехала ў Ліду. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працавала ў лідскай раённай газеце “Уперад”. Партызанская сувязная. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Пасля вайны працавала ў мінскіх выдавецтвах “Піянер Беларусі”, “Звязда”. Аўтар васьмі зборнікаў паэзіі і дзвюх кніжак для дзяцей. Жыла і памерла ў Мінску. Пахавана ў Калодзішчах (сёння ў межах Мінска).**



## Міхась Белавокі

(1916 - 1987)

**Самадзейны паэт-гавендыст. Жыў у в. Сарокі Лідскага раёна.
Складаў гумарыстычныя і сатырычныя вершы на беларускай мове.
Некаторыя з іх надрукаваны ў часопісе “Лідскі летапісец”.
Пахаваны ў Радзівонішках.**



# Антоні Масьлінскі

**(13 ліпеня 1917 г. (1918 г.) - 14 мая 1994 г.)**

**Нарадзіўся ў Вільні, выпускнік Дзяржаўнай гімназіі імя Караля Хадкевіча ў Лідзе і Універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні, прафесар, доктар звычайны гуманітарных навук Люблінскага Каталіцкага Універсітэта, доктар габілітаваны Гістарычнага факультэта Варшаўскага ўніверсітэта. Паэт. Напісаў цыкл вершаў "Ліда - край гадоў дзяціных". Памёр і пахаваны ў Любліне.**




# Вера Ляцецкая

**(18 сакавіка 1918 - 25 сакавіка 2004)**

**Нарадзілася ў в. Язвіны Уздзенскага раёна. Скончыла Мінскі польскі педтэхнікум. У 1939 г. была накіравана ў Беласток выкладаць польскую мову. У 1941 г. пры эвакуацыі была паранена. Была ў падпольнай арганізацыі на Уздзеншчыне. У Лідзе з 1963 года. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры. Вершы друкаваліся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Памерла і пахавана ў Лідзе.**



# Уладзімір Урбановіч

(1 жніўня 1921- 2 лютага 1999)

Нарадзіўся ў вёсцы Пудзіна на Лідчыне ў сялянскай сям'і. Здаў экзамены за 7 класаў польскай школы. Друкавацца пачаў у газеце "Ziemia Lidzka" ў 1939 г. Працаваў настаўнікам пачатковых класаў у Лідзе і Біскупцах Лідскага раёна. Пасля вайны завочна скончыў Лідскае педагагічнае вучылішча і літаратурны факультэт Гродзенскага педінстытута. З 1959 года працаваў у Валеўскай сярэдняй школе Навагрудскага раёна. Актыўна займаўся літаратурным краязнаўствам. Выдаў краязнаўчыя кнігі "Па дарагіх мясцінах" (Мн., 1964), "Шляхамі паэтаў і герояў" (1970). Выдатнік народнай асветы.  Памёр у Валеўцы, дзе і пахаваны, пасмяротна занесены ў Кнігу Славы Навагрудскага раёна.



# Земавіт Фядэцкі

**(22 жніўня 1923 - 8 студзеня 2009)**

**Славіст, фальклярыст і перакладчык. Нарадзіўся ў маёнтку Лебяда Лідскага павета, непадалёк Мажэйкава. У цяжкія часіны вайны жыў у вёсцы Феліксава, у сям'і свайго сябра Уладзіміра Мальца. Запісваў беларускія народныя песні. З канца вайны працаваў прэс-аташэ ў польскім пасольстве ў Маскве. У 1948-50 гг. працаваў шэфам аддзялення рускай літаратуры ў выдавецтве "Czytelink". З 1950 года рэдактар часопіса "Tworczosc". Народныя песні з вёскі Феліксава былі выдадзены ў зборніку "Цёплыя вечары… ды халодныя ранкі… czyli co spiewano w Fieliksowie", які выйшаў у 1992 годзе. Памёр у Варшаве. Месца пахавання - Старыя Павонзкі.**



## Мікалай Дзікевіч

**(20 верасня 1924 - 8 кастрычніка 2021)**

**Нарадзіўся ў в. Дзітрыкі Беліцкай гміны Лідскага павета. У 1939 г. закончыў Ганчарскую паўшэхную школу, у 1945 г. - Лідскае педвучылішча. Служыў у арміі (1946 - 1947). Закончыў Мінскі інстытут фізічнай культуры (1955). 46 гадоў працаваў настаўнікам у школах Лідчыны. Узнагароджаны медалямі “За доблесную працу” (1970), “За працоўную доблесць” (1981). Аўтар краязнаўчых кніг “Дзітрыкі. Згукі заснуўшай цывілізацыі” (200 стар.) “Сялец. Прынёманская рэчаіснасць” (294 стар.), а таксама шэрагу публікацый у перыядычным друку. Пахаваны ў Сяльцы.**



## Юзаф Кардаш

**(29 верасня 1924 - 13 кастрычніка 2015)**

**Нарадзіўся ў невялікай вёсачцы Колышкі каля Ліды. У 1949 годзе закончыў Лідскае педагагічнае вучылішча. Працаваў дырэктарам Гярвенікскай і Аўсядаўскай школ Лідскага раёна. Летам 1959 года Юзаф Нікадзімавіч з сям'ёй выехаў у Польшчу. Там ён паступіў у педагагічны інстытут і пасля заканчэння быў прызначаны дырэктарам школы ў вёсцы Флёрчакі, дзе адпрацаваў 25 гадоў. По ўспамінах і матэрыялах, у 1997 годзе выйшла яго кніга “Ліда праўдзівая” (“Lida Prawdziwa”). Пахаваны ў вёсцы Флёрчакі.**



## Іван Саўко

**(19 лютага 1925 - 9 чэрвеня 1998)**

**Нарадзіўся ў Навагрудскім раёне. Выпускнік Віцебскага ветэрынарнага інстытута, галоўны ветурач саўгаса "Тарнова" (1957 - 82), працаваў у Лідскай раённай станцыі па барацьбе з захворваннямі жывёл. Друкаваўся з 1960 г. Выдаў тры зборнікі паэзіі: "Насуперак лёсу" (1993), "Рэха жыцця" (1994), "Голас сэрца" (1996).**



# Мікола Лазоўскі

**(20 лютага 1926 - 26 чэрвеня 2009)**

**Нарадзіўся ў в. Лазяны Лідскага павета. Удзельнік штурму Берліна. Вызваляў Кракаў і Прагу. Узнагароджаны 12-цю баявымі ўзнагародамі. Працаваў электрыкам і апаратчыкам у Лідскай дыстанцыі пуці, мастаком-афармляльнікам на Лакафарбе. Завочна закончыў Маскоўскі ўніверсітэт выяўленчага мастацтва. Маляваў карціны і абразы для лідскіх цэркваў і касцёлаў. Самадзейны паэт. Пісаў гумарыстычныя і публіцыстычныя вершы.**



## Пётр Калбыка

**(1926 - 6 лютага 1945)**

**Паэт. Нарадзіўся ў в. Шынкоўцы каля Астрына Лідскага павета. Вучыўся ў Шчучынскай беларускай настаўніцкай семінарыі. Загінуў на фронце ва Усходняй Прусіі. Вершы надрукаваны ў 4-м (2000) і 5-м (2001) зборніках “Ад лідскіх муроў”, “Недаспяваныя песні” (2015), “Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны” (том 19, 2020).**

*Партрэт рэстаўраваны Аленай Несцеравай.*



# Анатоль Кулеш

**(5 мая 1927 - 21 сакавіка 2014)**

**Нарадзіўся ў вёсцы Збляны Лідскага павета. Пачаў вучобу ў польскай школе першай ступені з адным настаўнікам. У 6 клас СШ № 1 г. Ліды пайшоў ужо пасля вайны - 1 кастрычніка 1944 года - у Лідскую СШ №1. Закончыў спецгрупу Лідскага педвучылішча па падрыхтоўцы настаўнікаў пачатковых класаў з гадзічным тэрмінам навучання. Працаваў у Лідскай працоўнай дзіцячай калоніі МУС, у камсамоле, у школах Лідчыны. Закончыў геаграфічнае аддзялення фізіка-геаграфічнага факультэта БДУ. Прафесійна займаўся краязнаўствам. Выдаў першую кнігу па гісторыі Ліды “Горад Ліда: гісторыя, легенды, факты”. Працаваў у складзе рабочай групы па напісанні кнігі “Памяць. Ліда і Лідскі раён”. Памёр у Лідзе.**



## Віктар Каваленка

**(21 ліпеня 1929 - 17 жніўня 2001)**

**Нарадзіўся ў вёсцы Сакаўшчына Валожынскага раёна Мінскай вобласці. У 1948 г. скончыў Лідскае педагагічнае вучылішча. Настаўнічаў. У 1949-1953 гг. вучыўся на факультэце мовы і літаратуры Мінскага педінстытута. Пасля заканчэння аспірантуры (1958) - навуковы супрацоўнік, з 1982 г. дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Член-карэспандэнт АН БССР, доктар філалагічных навук. Сябра СП СССР з 1962 г. Заслужаны дзеяч навукі БССР (1981). Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі. Аўтар многіх літаратуразнаўчых кніг, а таксама рамана “Падвышанае неба” (1978). Лаўрэат літаратурных прэмій. Пахаваны на могілках “Калодзішчы” пад Мінскам.**



## Уладзімір Дронаў

Нарадзіўся 1 мая 1930 года ў Саратаўскай вобласці - у вёсцы Ляхаўка Туркаўскага раёна. У 1957 годзе закончыў Вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча імя К.Я. Варашылава. З 1959 года - у Ракетных вайсках стратэгічнага прызначэння ў горадзе Лідзе. Пасля службы ў розных месцах СССР з 1998 года стала жыве ў г. Лідзе. Палкоўнік у адстаўцы. Піша вершы з 30 год. Аўтар чатырох кніг. Член літаратурнага аб'яднання "Суквецце" пры рэдакцыі "Лідскай газеты".



# Ірэна Стасевіч-Ясюкова

(1929 - 21 сакавіка 2011)

Доктар габілітаваны, прафесар Варшаўскага ўніверсітэта, кіраўнік Камітэта гісторыі навукі і тэхнікі Польскай акадэміі навук, аўтар шматлікіх публікацый. Нарадзілася ў Лідзе, адукацыю даатрымала ў Беластоку. Заснавала гістарычна-біяграфічную серыю “Знакамітыя палякі Лідчыны”, але кнігі, якія выходзілі ў гэтай серыі былі пра ўраджэнцаў Лідчыны і Беларусі. Пачынаючы з 2-й кнігі пані Ірэна пастанавіла, каб кніжкі выходзілі на польскай і беларускай мовах. Выйшла 11 кніг, тры з якіх належаць пяру Ірэны Стасевіч-Ясюковай. Памерла і пахавана ў Варшаве.



## Алеся Бурак

**(17 снежня 1930 - 24 жніўня 2017)**

**Нарадзілася ў в. Варацец Хойніцкага р-на. Скончыла Дукорскую школу на Міншчыне і сталічны педінстытут імя Горкага. З 1955 года настаўнічала на Лідчыне. Друкавалася ў газетах “ЛіМ”, “Вячэрні Мінск”, у зборніку “Ад лідскіх муроў”, раённых і абласных газетах. Аўтар кнігі паэзіі “Прастора дабрыні”.**



## Уладзімір Сарока

**(20 чэрвеня 1931 - пасля 2002)**

**Нарадзіўся ў в. Місуры Дакудаўскай гміны, цяпер Лідскага р-на. У 1951 г. скончыў Бердаўскую СШ з сярэбраным медалём. Пасля заканчэння ў 1956 г. філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта - карэктар лідскай аб'яднанай газеты "Уперад". З 1957 г. на розных рэдактарскіх і навуковых пасадах у Мінску. Кандыдат навук. Больш за 100 апублікаваных прац, 6 вучэбных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры, 3 слоўнікі, больш за 30 артыкулаў. На яго рахунку звыш 40 перакладаў кніг на беларускую мову. Размаўляў толькі па-беларуску.**



## Уладзімір Логаш

**(10 снежня 1931 - 22 красавіка 2020)**

**Нарадзіўся у вёсцы Ахонава Дзятлаўскага раёна. Пасля заканчэння школы ў 1950 г. паступіў на будфакультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. Пасля заканчэння прыехаў у г. Ліду на сталую працу ў будаўнічае кіраванне на пасаду прараба. Працаваў на многіх будоўлях пасляваеннай Ліды, непасрэдна ўдзельнічаў у адбудове і разбудове горада. Дайшоў да пасады старшыні Лідскага гарвыканкама. Ён аўтар многіх краязнаўчых артыкулаў і ўспамінаў, якія пісаў па-беларуску. Друкаваўся ў газеце “Наша слова” і ў часопісе “Лідскі летапісец”. Памёр у Гродна.**



# Смарагд Сліўко

(16 снежня 1931 - 5 жніўня 2006)

**Нарадзіўся ў г. Яраслаўлі ў сям'і акцёра і паэта. З 1946 г. жыў у Беларусі. Пасля заканчэння Гродзенскага педінстытута з 1961 па 1966 г. працаваў настаўнікам гісторыі, рускай мовы і літаратуры ў Астравецкай СШ. Затым лёс звязаў яго з Лідчынай. Пісаў сцэнарыі, музыку, вершы. Друкаваўся ў многіх часопісах, газетах. Аўтар чатырох зборнікаў паэзіі, прозы і гумару. Памёр і пахаваны ў Лідзе.**



# Фёдар Кардаш

**(5 студзеня 1932 - пасля 1995)**

**Нарадзіўся ў в. Харашкі Дзятлаўскага раёна. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Працаваў у розных газетах, а з 1961 года літработнікам у лідскай газеце "Уперад". З 1966 года на працягу 20 гадоў Фёдар Кардаш працаваў уласным карэспандэнтам газеты "Гродзенская праўда" па "Лідскім кусце" (Ліда, Лідскі, Іўеўскі, Воранаўскі раёны). У пачатку 90-х заснаваў і выдаў 23 асобнікі першай лідскай недзяржаўнай газеты "Народная трыбуна" (пазней "Голас з Ліды"). Асноўная літаратурная праца "У цянётах акупацыі".**



## Мікалай Дзелянкоўскі

**(2 лютага 1932 - 27 чэрвеня 2014)**

**Нарадзіўся ў мястэчку Скідзель. Скончыў аддзяленне журналістыкі філфака БДУ (1952-57). Працаваў у лідскай газеце “Уперад” (1957-1962), кіраваў літаратурным аб'яднаннем. Пазней працаваў у газеце “Мінская праўда” (1962-73), БелТА (1973-77), іншых выданнях. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995). Друкаваўся з 1949 года. Выдаў 8 кніг. Аўтар сцэнарыяў да тэлефільмаў і п'ес.**



## Мар'ян Баяровіч

**(1 студзеня 1933 г. - 21 жніўня 2006)**

**Нарадзіўся ў вёсцы Альгецішкі Ашмянскага павета. З верасня 1954 г. па жнівень 1958 г. вучыўся ў Гродзенскім музпедвучылішчы, а з верасня 1958 г. па студзень 1975 г. ужо працаваў выкладчыкам, загадчыкам аддзялення, намеснікам дырэктара па навучальнай рабоце Гродзенскага музпедвучылішча. З 1975 г. працаваў намеснікам дырэктара, з 1977 г. - дырэктарам Лідскага музвучылішча, а з лістапада 1996 г. - выкладчыкам. Меў шмат узнагарод. Пісаў вершы, байкі. Друкаваўся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Пахаваны на лідскіх могілках “Зосіна”.**



## Аляксандр Жалкоўскі

**(1 сакавіка 1933 - 14 красавіка 2011)**

**Нарадзіўся ў в. Сасновы Бор (да перайменавання - Цёмнае Балота) Шчучынскага павета. Працаваў адказным сакратаром Васілішкаўскай раённай газеты (1950 г.), рэдактарам Воранаўскай (1961-1962 г.) і Мастоўскай (1965-1969 гг.) раённых газет. У Лідзе з 1962 г. Рэдактар лідскай газеты “Уперад” у 1969-89 гг. Наступныя гады працаваў уласным карэспандэнтам абласной газеты “Гродзенская праўда”. Адзін са стваральнікаў лідскай кнігі “Памяць”. Аўтар мноства артыкулаў у розных выданнях Беларусі. Пахаваны на лідскіх могілках “Зосіна”.**



# Наталля Чакліна-Гарбачова

**Нарадзілася 30 чэрвеня 1933 года ў г. Свярдлоўску, дзе і жыла ў ваенныя гады. У 1950 годзе пасля заканчэння школы паступіла на літаратурны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна. У 1961 годзе пераехала ў Ліду, дзе працавала інструктарам гаркама партыі, у СШ № 3. Друкавалася ў лідскай газеце “Уперад”. Пераехала ў Гродна. Была кіраўніком літаратурнага гуртка ў Гродзенскім абласным палацы піянераў. Друкавалася ў абласных і рэспубліканскіх выданнях. Аўтар сямі зборнікаў паэзіі. Член Гродзенскага аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”. Жыве ў г. Гродна.**



## Таццяна Сямёнава

**Нарадзілася 17 сакавіка 1935 года ў сяле Грачоўка Арэнбургскай вобласці. З 1952 па 1955 год вучылася ў дашкольным педагагічным вучылішчы ў горадзе Бузулук Арэнбургскай вобласці. Восенню 1955 года прыехала ў Ліду, па месцы жыхарства мужа. Працавала ў дзіцячых дашкольных установах выхавальніцай, затым загадчыцай. Друкуецца ў “Лідскай газеце”, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. Аўтар паэтычных зборнікаў “Осенний вальс” (2012) і “Позвала судьба в дорогу” (2016), “Поэзия души моей” (2025). Жыве ў Лідзе.**



## Сымон Лапата

**Нарадзіўся 10 ліпеня 1935 года ў в. Бурдукі Іўеўскага раёна. Скончыў Мінскі фінансава-эканамічны тэхнікум, Мінскі інстытут народнай гаспадаркі. Працаваў у Лідзе ў кантрольна-рэвізійным упраўленні Мінфіна Беларусі. Вершы надрукаваны ў зборніку “Ад лідскіх муроў” № 4 (2000). Жыве ў Лідзе.**

*Партрэт рэстаўраваны Аленай Несцеравай.*



## Уладзімір Васько

**Паэт, празаік, журналіст. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2007 па 2021 год. Нарадзіўся 2 студзеня 1937 г. у в. Ліпічанка Шчучынскага раёна. Працаваў у рэдакцыях шчучынскай, дзятлаўскай і лідскай (1972-2000) раённых газет. Друкуецца ў рэспубліканскім, абласным і раённым друку. Выдаў дзевяць кніг паэзіі і прозы. Лаўрэат прэмій імя Анатоля Іверса 2022 года і імя Веры Навіцкай 2024 г. Жыве ў Лідзе.**



## Данута Бічэль (Бічэль-Загнетава)

**Нарадзілася 3 снежня 1937 (1 студзеня 1938) у в. Біскупцы Лідскага павета - беларуская паэтэса. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1984) за зборнік вершаў “Дзе ходзяць басанож”. Скончыла Навагрудскае педагагічнае вучылішча (1957), аддзяленне беларускай мовы, літаратуры і гісторыі Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы (1962). З 1962 года выкладала беларускую мову і літаратуру ў школах г. Гродна. Член СП СССР (1964). З 1982 загадчыца Дома-музея Максіма Багдановіча ў г. Гродна. Аўтар вялікай колькасці кніг паэзіі і прозы. Узнагароджана медалём. Жыве ў г. Гродна.**



## Мікалай Герасімовіч

**(18 сакавіка 1937 - 7 верасня 2022)**

**Нарадзіўся ў в. Мазалі Салігорскага р-на. У1954 г. скончыў Чаплічскую сярэднюю школу са срэбным медалём і паступіў у Беларускі політэхнічны інстытут на хіміка-тэхналагічны факультэт па спец. “Тэхналогія сілікатаў”. Працаваў у Чыце, Пятроўску-Забайкальскім, Ялізаве Асіповіцкага р-на. У 1965 годзе быў пераведзены на шклозавод “Нёман”, на якім працаваў да 2002 г. Аўтар вялікай гістарычна-краязнаўчай працы “Шклозавод “НЁМАН”. Кароткі агляд станаўлення і развіцця”, апублікаванай у шэрагу нумароў часопіса “Лідскі летапісец”. Пахаваны ў Бярозаўцы.**



## Генаэфа Міхаловіч

**Стрыечная сястра Дануты Бічэль. Нарадзілася ў в. Біскупцы Лідскага павета. Была замужам у Дакудаве. Пасля смерці мужа вярнулася ў Біскупцы. Напісала паэму “Святая праўда пра ўсё жыццё на роднай мове, як размаўляем у вёсцы Біскупцы...”**



# Пятро Макарэвіч

(15 красавіка 1938 - 12 снежня 2014)

Нарадзіўся ў вёсцы Шынкі Крупскага раёна. Закончыў педінстытут імя Горкага (бібліятэчны факультэт). У 1964 г. быў размеркаваны ў Ліду. Працаваў у розных месцах. Каля 30 гадоў аддаў працы карэспандэнта на Лідскім радыё і ў рэдакцыі газеты "Уперад". Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў. Аўтар трох кніг паэзіі, шматлікіх публікацый у розных выданнях. Пахавалі паэта 14 снежня на старых лідскіх могілках па Гродзенскай дарозе.



# Алесь Стадуб

**(24 красавіка 1938 - 8 чэрвеня 2020)**

**Нарадзіўся ў в. Юшавічы Нясвіжскага раёна. Скончыў 10 класаў у Нясвіжы. Пасля службы ў войску закончыў Усесаюзны інстытут імя Крупскай і філфак педінстытута ў Яраслаўлі. У 1972 г. пераехаў у Ліду, дзе быў намеснікам старшыні таварыства “Веды”. Друкаваўся ў абласных і рэспубліканскіх выданнях. Аўтар звыш 10 кніг. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2007 года. Пахаваны ў Лідзе.**



## Святлана Цішук

**Паэт, драматург. Нарадзілася ў 1938 годзе ў г. Гомелі. Скончыла Гродзенскі фізкультурны тэхнікум і Гродзенскі педінстытут імя Янкі Купалы. Друкуецца з 1979 года. Аўтар зборніка паэзіі “На крылах белай вароны” (1999). Лаўрэат конкурсу імя Веры Навіцкай і міжнароднага конкурсу. Жыве ў Лідзе.**



# Уладзімір Мельнікаў

**(9 кастрычніка 1938 - 6 ліпеня 2022)**

**Мастак. Нарадзіўся ў Полацку. Жыў у Літве і Эстоніі. Вучыўся ў Талінскім мастацкім інстытуце на аддзяленні станковага жывапісу. Працаваў авіямеханікам, майстрам на заводзе, выкладчыкам у Лідскім тэхнікуме, літсупрацоўнікам газеты "Уперад". З 1991 г. актыўны ўдзельнік мастацкіх выставак. Намаляваў шмат знакавых для Беларусі партрэтаў. Пісаў прозу. Друкаваўся ў часопісе "Лідскі летапісец", іншых выданнях. Памёр у Лідзе. Пахаваны на Лідскіх могілках "Зосіна-2".** *Аўтапартрэт.*



# Леанід Казачэўскі

**(3 жніўня 1938 - 27 ліпеня 1963)**

**Жыў у Лідзе па вул. Камуністычнай. Працаваў рабочым лідскай электрастанцыі, з 1959 г. супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты "Уперад". Ён быў сябрам абласнога літаратурнага аб'яднання, вершы яго друкаваліся ў газетах "Гродзенская праўда", "Знамя юности", "Сельская газета", у часопісе "Нёман". Трагічна загінуў - утануў у Нёмане. Пахаваны ў Лідзе на старых могілках па Гродзенскай дарозе.**



# Юзэфа Данілевіч

**Нарадзілася ў былым Лідскім павеце ў сям’і селяніна-серадняка. У 1962 годзе закончыла фізіка-матэматычны факультэт Магілёўскага педінстытута па спецыяльнасці “Фізіка і матэматыка”. Працавала ў Шчучынскім раёне выкладчыкам матэматыкі, а потым дырэктарам школы. З 1986 г. працавала выкладчыкам матэматыкі ў Лідскім педвучылішчы. Пісала вершы. Друкавалася ў зборніку “Ад лідскіх муроў”.**

*Партрэт рэстаўраваны Аленай Несцеравай.*



## Валер Санько

**(9 жніўня1939 - 22 лістапада 2020)**

**Нарадзіўся ў в. Вялікая Сліва пад Слуцкам. Закончыў Баранавіцкае медвучылішча (1958), завочна журфак БДУ (1967), Мінскую ВПШ (1978). Працаваў у газетах, выдавецтвах. Сябар Саюза журналістаў (1966), Саюза беларускіх пісьменнікаў (1997), доктар народнай медыцыны, магістр нетрадыцыйнай медыцыны, член-кар. МА энергаінфармацыйных навук. Аўтар і суаўтар 17 кніг. Каля дзесяці апошніх гадоў жыў у г. Лідзе. Друкаваўся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Памёр ад каронавірусу. Крэміраваны. Урна з прахам пахавана на могілках в. Вялікая Сліва.**



## Кастусь Тарасаў

**(10 кастрычніка 1940 - 20 сакавіка 2010)**

**Беларускі пісьменнік, журналіст. Майстар гістарычнай прозы, аўтар гістарычных аповесцей пра мінулае Беларусі. Член Саюза пісьменнікаў СССР і Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1982. Нарадзіўся ў Мінску. Вучыўся на хімічным факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута (1960-1965). Пасля заканчэння інстытута працаваў майстрам шкловарэння на шклозаводзе “Нёман”, тэхнолагам на віцебскім заводзе “Маналіт”. Працаваў у розных выданнях. Рэдактар газеты “Новы час”. Памёр у Мінску. Пахаваны на мінскіх Чыжоўскіх могілках.**



# Ірэна Сліўко

Нарадзілася 28 студзеня 1941 года ў вёсцы Залейкі Іўеўскага раёна. Закончыла Морынскую сярэднюю школу, Мінскі фінансавы тэхнікум па спецыяльнасці “Фінансіст” і Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі па спецыяльнасці “Эканаміст”. Працавала 7 гадоў у Астравецкім райфінаддзеле, а затым у Лідскім гарфінаддзеле на пасадах эканаміста, старшага эканаміста і начальніка бюджэтнага аддзела. Вершы і пераклады друкавала ў многіх выданнях. Выдала зборнік паэзіі “Выток пачынаўся ад Гаўі” (2021). Жыве ў Лідзе.



# Віктар Кудла

**Нарадзіўся 17 кастрычніка 1941 года ў сялянскай сям'і ў в. Дроздава Лідскага раёна. Пасля Жучкоўскай пачатковай школы прадоўжыў навучанне ў Ганчарах. Скончыў Ганчарскую сярэднюю школу ў 1959 годзе на 4-5 і без экзаменаў паступіў у Гродзенскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Чатыры гады тэрміновай службы (1962 - 1966) служыў на флоце. Пасля заканчэння Гродзенскага сельгасінстытута працаваў на розных пасадах у сельскай гаспадарцы Лідскага раёна. У сакавіку 1979 года ўзначаліў эксперыментальную базу "Ніва" і вывеў яе ў перадавыя.**

**Напісаў вялікую колькасць краязнаўчых і публіцыстычных артыкулаў у асноўным для часопіса "Лідскі летапісец". Жыве ў аг. Дворышча.**



# Іван Русецкі

**Нарадзіўся 28 верасня 1944 года ў прыгарадзе Гродна. Закончыў музвучылішча ў г. Гродна, дырыжорска-выканаўчы факультэт інстытута культуры ў Мінску. Працаваў выкладчыкам па класу скрыпкі, а таксама дырыжорам харавых калектываў і камернага аркестра ў Лідскай дзіцячай музычнай школе. Аўтар песень, якія выконваюцца на пляцоўках г. Ліды. Піша вершы на беларускай, рускай, польскай, французскай, нямецкай, англійскай мовах. Друкаваўся ў перыядычных выданнях "Лідская газета" і "Принеманские вести". Жыве ў Лідзе.**



# Валерый Сліўкін

**Нарадзіўся ў Лідзе 8 чэрвеня 1945 г. Закончыў Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт (1968) і аспірантуру пры МДУ (1971), абараніўшы кандыдацкую дысертацыю. Кандыдат геаграфічных навук. Працаваў выкладчыкам у Казахскім універсітэце, у геалагічных арганізацыях на Далёкім Усходзе, у Магаданскай вобл. і Казахстане. У 1982 годзе вярнуўся ў Ліду. Працаваў у Лідскім гісторыка-мастацкім музеі. Публікаваўся ў часопісе “Лідскі летапісец”, у “Лідскай газеце”, на сайце lida.info. Напісаў некалькі соцень артыкулаў. Аўтар і суаўтар больш пяці кніг. Жыве ў Лідзе.**



## Ганна Гайдукевіч

**Нарадзілася 29 кастрычніка 1945 годаў вёсцы Дакудава. Пасля заканчэння Дакудаўскай сярэдняй школы вучылася ў Гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы, а затым у ГрДУ імя Янкі Купалы (філфак, беларуская і руская мовы). Працавала ў школах Лідчыны, дваццаць гадоў - у Лідскім педвучылішчы выкладчыкам музыкі, беларускай мовы і літаратуры. Друкавалася ў "Лідскай газеце", у зборніку "Ад лідскіх муроў", у газеце "Літаратура і Мастацтва". У 2023 годзе ў Мінску выйшла яе кніга "З душой і жартам". Жыве ў Лідзе.**



## Леапольд Пырскі

**Нарадзіўся 10 сакавіка 1946 года ў вёсцы Юравічы Гродзенскага раёна. Вучыўся на факультэце журналістыкі Свярдлоўскага ўніверсітэта, скончыў юрыдычны факультэт БДУ. Да 2020 года жыў у Лідзе. Працаваў адвакатам. Аўтар цыклу вершаў “Мне люба ўсё” ў зборніку “Откровение” (2000).**



## Рычард Смольскі

**Нарадзіўся ў г. Лідзе 3 красавіка 1946 г. у сям'і рабочых. Скончыў лідскую СШ № 10, тэатральны факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1970). Доктар мастацтвазнаўства (1991). Рэктар Беларускай Акадэміі Мастацтваў з 1997 па 2010 г. Сябар Беларускага саюза тэатральных дзеячаў з 1977 года, сябар Беларускага саюза літаратурна-мастацкіх крытыкаў з 1997 года. Аўтар шэрагу кніг і манаграфій аб беларускім тэатры і яго майстрах. Жыве ў Мінску.**



# Людміла Русь

**Нарадзілася 8 жніўня 1946 года ў сяле Міхайлаўскім Растоўскай вобласці ў сям'і вайскоўца і настаўніцы. Закончыла педагагічны інстытут. Выйшла замуж за вайскоўца. Працавала ў школе настаўніцай рускай мовы і літаратуры, а потым у СШ № 9 настаўніцай сусветнай мастацкай культуры. Піша вершы і прозу. Член некалькіх літаратурных аб’яднанняў. Пераможца і прызёр многіх літаратурных конкурсаў. Жыве ў Лідзе.**



# Ларыса Канчэўская

**(9 кастрычніка 1946 - 15 сакавіка 2021)**

**Дачка афіцэра, нарадзілася на востраве Сахалін. У дзяцінстве жыла ў Расіі і Латвіі. З 1956 г. - у г. Лідзе. Скончыла філфак БДУ. Працавала на розных пасадах ад рабочай да выкладчыка педвучылішча. Іграла ў народным тэатры, усё жыццё пісала вершы і прозу, мела “абсалютны” літаратурны слых і вытанчаны густ. Калі-нікалі друкавалася ў “Лідскай газеце”, газеце “Чистый мир”, у зборніку “Ад Лідскіх муроў”, у часопісе “Лідскі летапісец”. Напісала таленавітую “Маленькую аповесць пра любоў” - лірычныя ўспаміны пра дзяцінства, якое прайшло ў Лідзе (“Ад лідскіх муроў”, № 8). Памерла і пахавана ў Мінску.**



## Лізавета Палеес

**Нарадзілася 24 лістапада 1947 года ў горадзе Магілёве. Дзіцячыя і школьныя гады прайшлі ў горадзе Лідзе. Першыя вершы былі надрукаваны ў лідскай газеце “Уперад”. Скончыла філфак БДУ. Працавала бухгалтарам, пазней - выхавацелем у дзіцячым садку, у літаратурных выданнях. Паэт, перакладчык, празаік, журналіст, філолаг. Аўтар шматлікіх кніг паэзіі, перакладаў, анталогій, дзіцячых кніг, а таксама калектыўных зборнікаў, выдадзеных у Германіі і Балгарыі. Друкавалася ў выданнях многіх краін. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. Жыве ў Мінску.**



**Анастасія Каладзяжная**

**Нарадзілася 15 красавіка 1948 года ў в. Чарнеевічы Драгічынскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1966 годзе скончыла Міжлескую сярэднюю школу і паступіла на гістарычны факультэт БДУ. Працуе ў Лідскім гісторыка-мастацкім музеі. Аўтар і суаўтар некалькіх вялікіх краязнаўчых прац. У 2014 годзе да 100-годдзя з дня нараджэння В. Таўлая выдала кнігу "Этапы жыццёвых дарог", а ў 2018 - "Память - главный свидетель". Жыве ў Лідзе.**



**Антон Піліпчык**

**(1948 - 14 чэрвеня 2025)**

**Нарадзіўся ў вёсцы Сухары Шчучынскага раёна. Скончыў журфак БДУ і аддзяленне друку, радыё і тэлебачання МВПШ. Працаваў у рэдакцыях шчучынскай, астравецкай раённых газет, а з кастрычніка 1979 па лістапад 2014 года - у іўеўскай раёнцы. Пісаў вершы і прозу. Друкаваўся ў рэспубліканскіх і мясцовых выданнях. Аўтар зборнікаў вершаў “Лятуць восені, зімы, як і вёсны, і леты…” (2018), “Безбярэжжа” (2020), кніг прозы “Пакуль сонейка ззяе…” (2019), “Тэрмінова ў нумар” (2025). Апошні час жыў і памёр у Бярозаўцы Лідскага раёна. Пахаваны ў в. Рачкавічы Шчучынскага раёна.**



# Уладзімір Янцэвіч

**Нарадзіўся 25 мая 1948 года ў г. Лідзе, фотамастак. Закончыў СШ № 8 г. Ліды. Закончыў кінафакультэт Маскоўскага завочнага ўніверсітэта фотамастацтваў у 1980 г. За гады творчай дзейнасці стварыў болей за 300 фотакарцін, якія аздобілі інтэр'еры дзяржаўных устаноў, офісаў, бальніц і г.д. Болей за 50 прац фотамастака ўпрыгожваюць замежныя пасольствы ў Рэспубліцы Беларусь і знаходзяцца ў прыватных калекцыях. Ён - аўтар каляровых паштовак, прысвечаных роднаму гораду. У 1987 годзе ўзнагароджаны медалём ВЦСПС "За дасягненні ў самадзейным мастацтве". Захапляецца паэзіяй. Жыве ў Лідзе.**



# Марыя Ганчар

**Нарадзілася 13 верасня 1948 года ў вёсцы Погіры Дзятлаўскага раёна. Закончыла Гродзенскі педінстытут. Працавала загадчыцай сельскага клуба, настаўніцай матэматыкі і спеваў, выхавацелем у дзіцячым садку, загадчыцай дзіцячага садка, намеснікам дырэктара сярэдняй школы. Зараз на пенсіі. Валанцёр сацыяльнага цэнтра і Чырвонага Крыжа. Друкавалася ў зборніку "Ад лідскіх муроў". Жыве ў Лідзе.**



# Міхась Мельнік

**Нарадзіўся 7 лістапада 1949 года на Магілёўшчыне (вёска Майсеевічы Асіповіцкага раёна), але вось ужо 45 гадоў яго жыццё цесна звязана з Лідчынай. Скончыў філфак Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы, працаваў у школах, прафтэхвучылішчы, шмат гадоў выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Лідскім каледжы. Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Выдаў зборнікі вершаў “Скрыжаванне”, “Лодка жыцця”, “З табою”. Адзін з арганізатараў устаноўкі помніка Ф. Скарыну ў Лідзе. Жыве ў Лідзе.**



## Віктар Бачароў

**(8 лютага 1950 - 3 кастрычніка 2004)**

**Нарадзіўся ў Краснаярску, выпускнік Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута (1975). У Лідзе з 1975 г. Працаваў на розных работах. З 1986 г. дырэктар СШ № 13. Паэт і празаік, аўтар кніг “Разговор” (1996), “Пора брать” (1998), “Калі адзвінеў званок” (1998), “Дембель неизбежен” (1999), “Стихи из прошлого века” (2001). Пасмяротныя зборнікі: “Золотая тёлка или по следам золотого телёнка” (2006), “Птица из Персидского залива” (2010). Памёр у Мінску. Крэміраваны і пахаваны на Паўночных могілках Мінска.**



## Аркадзь Дзвілянскі

**Нарадзіўся 2 верасня 1950 г. у Лідзе. Вучыўся ў СШ № 8 і СШ № 1, а таксама ў музычнай школе. Закончыў гістарычна - тэарэтычны факультэт Уральскай кансерваторыі (1978). Працаваў у Кіргізскім інстытуце мастацтваў (1978 - 93) і Акадэміі музыкі ў Магілёве (1993 - 96). Кандыдат мастацтвазнаўства (1989), дацэнт (1995). Выдаў некалькі метадычных дапаможнікаў, зборнік паэзіі “Сімфарыфмы” (1992), і аповесць у прозе і вершах “Крысбэйл” (1993). Цяпер жыве ў Стэмфардзе (ЗША).**



## Людміла Шот

Нарадзілася 1 ліпеня 1951 г. у вёсцы Копанькі Гродзенскага раёна. У Лідзе з 1988 года. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Працавала загадчыцай дзіцячага сада № 25 станцыі Ліда. Жыве ў Лідзе. Друкуецца ў мясцовым друку.



# Іван Гушчынскі

**Нарадзіўся 7 ліпеня 1951 года ў вёсцы Парэчча Лідскага раёна. У 1972 годзе закончыў філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы. Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў школах Лідчыны і на заводзе “Лідсельмаш”. Паэт. Друкуецца з 1974 года. Аўтар кнігі “Ідзі і вяртайся”. Жыве ў Лідзе.**



## Аляксандр Юрэвіч

**Нарадзіўся ў в. Крупава Лідскага раёна 18 лістапада 1952 г. У 1957 г. бацькі пераехалі ў Польшчу. Вучыўся на філалагічным факультэце Гданьскага ўніверсітэта, завочна - на сцэнарным аддзяленні Вышэйшай школы фільма, тэлебачання і тэатра ў Лодзі (1982-83). Працаваў у Гданьскай ваяводскай бібліятэцы, у рэдакцыі літаратурных часопісаў "Podpunkt" (1984-89), "Tytul" (з 1990). Друкуецца з 1973 года. Выдаў кнігі паэзіі і прозы "Сон, які напэўна не быў каханнем" (1974), "На другім баку" (1978), "Не страляйце ў Беатлесаў" (1983), "Як галубы, гнаныя бурай" (1990), "Пакуль яшчэ і іншыя вершы" (1991), "Сярод ночы" (1980), "Ліда" (1990, 1994), "Пан Бог не чуе глухіх" (1995).**



## Ларыса Кавалеўская

**Нарадзілася ў 1953 годзе ў вёсцы Каўшары Іўеўскага раёна. Скончыла 10 класаў Трабскай сярэдняй школы. Працавала ў Іўі старшай піянерважатай, у гэты перыяд і пачала пісаць вершы. Пасля пераезду ў Ліду служыла ў вайсковай частцы ў Паўднёвым гарадку, працавала на розных работах. Зараз на пенсіі. Друкавалася ў “Лідскай газеце” і зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**



## Уладзімір Нікулін

**Нарадзіўся ў 1953 годзе ў г. Лідзе. У 1974 годзе закончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Прымаў удзел у будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі. Друкаваўся ў абласных і раённых газетах “Светлы шлях”, “Лідская газета”, а таксама ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**



## Тадэвуш Чарнавус

**(19 чэрвеня 1954 - 5 лістапада 2022)**

**Нарадзіўся на Лідчыне ў вёсцы Рылаўцы. Вучыўся ў Яўсеевіцкай васьмігадовай школцы, скончыў Лідскі індустрыяльны тэхнікум, падчас службы ў арміі - завочную школу ваенных карэспандэнтаў. Завяршыў адукацыю на факультэце журналістыкі БДУ. Працоўны і творчы шлях пачынаў у навагрудскай раённай газеце “Новае жыццё”, але найбольш - амаль тры дзесяцігоддзі - шчыраваў у “Лідскай газеце”. Друкаваўся ў сямі паэтычных зборніках. Ужо на пенсіі, у “Лідскай газеце” ў якасці пазаштатнага аўтара вёў рубрыку “Матчына мова: гаворым па-беларуску”. Памёр у Лідзе. Пахаваны на лідскіх могілках “Зосіна-2”.**



## Раман Кіман

**Нарадзіўся 2 ліпеня 1954 года ў вёсцы Клюкавічы, Беліцкага сельскага савета Лідскага раёна ў сям'і калгаснікаў. У 1969 годзе закончыў Табальскую васьмігадовую школу, у 1971 годзе закончыў Дзітрыкаўскую сярэднюю школу. Закончыў Мінскі электратэхнікум сувязі. 1972 годзе быў прызваны ў Савецкую Армію. Працаваў у Лідскім агенцтве "Саюздрук", на камбінаце "Будматэрыялы" і ў Лідскім аддзеле Дэпартамента аховы. Вершы, байкі, апавяданні друкаваліся ў лідскай газеце "Уперад", а таксама ў газеце "Во славу Родины" і зборніку "Ад лідскіх муроў". Жыве ў Лідзе.**



## Станіслаў Суднік

**Нарадзіўся 21 верасня 1954 года ў в. Сейлавічы Нясвіжскага раёна. Падпалкоўнік у адстаўцы. У Лідзе з 1994 года. Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2001 па 2021 г. Друкаваўся ў літаратурных часопісах “Полымя”, “Маладосць”, “Верасень”, “Новы замак”, “Ад лідскіх муроў” . Аўтар кніг паэзіі “Пагоня за мову”, “Мой Грунвальд”, “Лідскія скрыжалі”, “Літва”, “Пілігрымка дадому”. Рэдактар і выдавец літаратурных альманахаў “Ад лідскіх муроў”, “Стольны град” (Навагрудак), “Нясвіжскі ўток”, “Родныя пагоркі” (Капыль). Жыве ў Лідзе.**



# Ірына Маркевіч

**Нарадзілася 6 кастрычніка 1954 г. у вёсцы Ельня Дакудаўскага (цяпер Трацякоўскага) сельсавета Лідскага раёна ў сялянскай сям'і. Вучылася ў Біскупскай васьмігадовай школе (1961 - 1969 гг.), Дакудаўскай сярэдняй школе (1969 - 1971 гг.), Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце (1972 - 1977 гг. ), у БДУ па спецыяльнасці выкладчык біялогіі і хіміі (1992 - 1996 гг.). Вершы пачала пісаць у 1999 годзе. Друкавалася ў “Лідскай газеце”, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. У 2022 годзе выдала кнігу вершаў “Даверлівы дыялог”. Лаўрэат шостага конкурсу імя Веры Навіцкай “Дарослыя - дзецям” (2024 г.). Жыве ў в. Дакудава.**



## Ірына Бараздзіна

**(19 лютага 1955 - 31 ліпеня 2019)**

**Скончыла ГрДУ імя Янкі Купалы, дзе атрымала прафесію настаўніка пачатковых класаў. Працавала на Далёкім Усходзе (у Хабараўскім краі), а затым у Лідзе: у Лідскім педвучылішчы (выкладчыкам педагогікі і псіхалогіі), у СШ № 11 (настаўнікам пачатковых класаў, паралельна кіравала тэатральным гуртком). Выйшлі два зборнікі яе вершаў: “Из соли, сахара и перца” (2015), “Живу по чувствам” (2018) і пасмяротны “Пусть будет...” (2020). Пісала таксама празаічныя творы. Памерла ў Лідзе. Пахавана на лідскіх могілках “Зосіна”.**



# Анатоль Крупа

**(2 сакавіка 1955 - 8 кастрычніка 2020)**

**На працягу 34 гадоў кіраваў Бердаўскай СШ Лідскага раёна. Выдатнік асветы Рэспублікі Беларусь (1996). Заснавальнік і кіраўнік Бердаўскага гістарычна-краязнаўчага народнага музея. Актывіст ТБМ, старшыня Лідскай раённай арганізацыі Таварыства беларускай школы. Аўтар краязнаўчых артыкулаў і кнігі "Пакінуць след на зямлі". Памёр у Бердаўцы ад каронавіруса, там жа і пахаваны.**



# Віктар Праўдзін

**Нарадзіўся 11 мая 1955 года ў горадзе Лідзе ў сям'і вайскоўца. У 1981 годзе скончыў Мінскую вышэйшую школу МУС СССР, мае адукацыю юрыста-прававеда. Першыя апавяданні пісьменніка пабачылі свет у 1987 годзе ў газеце “Звязда”, у 1988 годзе - у часопісе “Маладосць”. З 1994 года па 2001 год працаваў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса “Нёман”, з 2001 па 2002 выбіраўся першым намеснікам старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў. Працаваў у розных выданнях. Аўтар вялікай колькасці аповесцей і раманаў дэтэктыўнага жанру. Мае дзяржаўныя ўзнагароды. Лаўрэат літаратурнай прэміі Беларусі. Жыве ў Мінску.**



# Ала Юшко

**Нарадзілася 19 мая 1955 года ў вёсцы Кузьмічы Ваўкавыскага раёна. У Гродна вучылася на тынкоўшчыка-маляра. Жыве ў Лідзе з 1971 года. Працавала па прафесіі ў БМУ-175, ААТ "Ліданафтапрадукт". Друкавалася на старонках "Лідскай газеты", у зборніку "Ад лідскіх муроў" і ў іншых выданнях. Аўтар кніг "Лепестки судьбы" (2019) і "Ларчик с секретом" (2024).**



# Міхаіл Ёрш

Нарадзіўся 29 жніўня 1955 г. на Слонімшчыне. Закончыў Мінскі інстытут культуры ў 1979 г. Працаваў у Лідзе рэжысёрам народнага тэатра, дырэктарам гарадскога Дома культуры, загадчыкам аддзела культуры Лідскага гарвыканкама, з 1998 г. - у Белпрамбудбанку. У 1999 г. заснаваў газету “Принёманские вести”, быў першым рэдактарам. Паэт. Друкаваўся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.



# Крысціна Лялько

**Нарадзілася 30 сакавіка 1956 года на хутары Хадзюкі Лідскага раёна. Закончыла філфак БДУ. Працавала ў Літаратурным музеі Янкі Купалы, штотыднёвіку “Літаратура і мастацтва”, часопісе “Беларусь”. Галоўны рэдактар каталіцкіх часопісаў “Наша Вера” і “Ave Maria”. Аўтар шэрагу кніг прозы і паэзіі. Пераклала на беларускую мову чатыры кнігі Папы Яна Паўла II. Зрабіла шмат іншых перакладаў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларускай ССР. 18 снежня 2012 г. узнагароджана папскім медалём “Bene merenti” (“Заслужаным”) за вялікі ўклад у развіццё Касцёла ў Беларусі. Жыве ў Мінску.**



# Ірына Багдановіч

**Беларуская паэтэса, перакладчыца, літаратуразнаўца. Нарадзілася 30 красавіка 1956 г. у горадзе Лідзе. Выхоўвалася ў сям'і бабулі і дзеда ў Гомелі. Скончыла гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1978) і аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі Навук БССР (1983). Кандыдат філалагічных навук (1985). Працавала малодшым і старшым навуковым супрацоўнікам розных навуковых устаноў. Аўтар васьмі кніг паэзіі, шэрагу манаграфій і вялікай колькасці перакладаў з польскай мовы. Жыве ў Мінску.**



## Леанід Віннік

**(6 чэрвеня 1956 - 1 мая 2006)**

**Нарадзіўся ў г. Лідзе. Працаваў электрыкам на будаўніцтве трасы “Ніжневартаўск - Урэнгой”, бондарам на возеры Байкал, на Камчатцы, у Туапсэ, у лідскім БУ-133 і інш. Аўтар паэтычных зборнікаў: “Под погасшими звёздами” (1996), “Мелодии печального дождя” (1997), “Ностальгия” (1999), “Откровение” (2000), дзвюх краязнаўчых кніг “Зоркі лідскіх небасхілаў” (2001), “Время и судьбы” (2004). Пахаваны на могілках Лідскай Слабадской парафіі.**



## Дзмітрый Гуліцкі

**Нарадзіўся 24 чэрвеня 1956 г. у г. Лідзе. Скончыў СШ №1 у 1973 г., БДУ (механіка-матэматычны факультэт) у 1978 г. Працуе праграмістам. Піша вершы. Друкаваўся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”.**
**Жыве ў Лідзе.**



## Уладзімір Бурак

**Нарадзіўся 10 сакавіка 1957 года ў сям'і лідскіх настаўнікаў. Скончыў мясцовы індустрыяльны тэхнікум, дзе і працаваў майстрам па тэхнічным навучанні. Друкаваўся ў зборніку "Ад лідскіх муроў". Аўтар кнігі вершаў "Дарогі розныя бываюць" (2011). Жыве ў Лідзе.**



# Іосіф Кліз

**Нарадзіўся 17 мая 1957 года ў вёсцы Ятвезь Дзятлаўскага раёна. Вершы школьных гадоў друкаваліся ў раённай газеце “Перамога”, у дзіцячым часопісе “Бярозка”, студэнцкія - у “Гродзенскай праўдзе”, “Знамя юности” і ў калектыўным паэтычным зборніку “Наднёманскія галасы”. Скончыў філалагічны факультэт ГрДУ імя Янкі Купалы. Працаваў настаўнікам беларускай літаратуры ў СПТВ-196, а пасля службы ў войску - на заводзе “Лідсельмаш” і ў лакаматыўным дэпо Ліда. Ветэран працы. Жыве ў Лідзе.**



## Марыя Масла

**Нарадзілася 16 верасня 1957 года ў вёсцы Гурыны Дварышчанскага сельсавета Лідскага раёна. Вучылася ў Гервяніцкай васьмігадовай школе (1964-1970 гг.). Выпускніца Лідскай школы-інтэрната (1974 г.) і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (1980 г.). Працавала ў Няцецкай і Гярвяніцкай васьмігодках, у дзіцячым садзе № 17 г. Ліды. Вершы друкаваліся ў “Лідскай газеце”, “Нашым слове”, “Гродзенскай праўдзе”, “Принёманских вестях”, у часопісах “Пралеска”, “Вясёлка”, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**




## Алена Несцерава

**Нарадзілася 20 кастрычніка 1957 года ў горадзе Севераморску Мурманскай вобласці. Дзяцінства і школьныя гады прайшлі ў горадзе Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці. У 1981 годзе закончыла Ленінградскі інстытут дакладнай механікі і оптыкі. Была накіравана на працу на завод “Оптык” у Ліду, дзе працавала да 2014 года. Малюе і піша вершы. Паэтычныя творы друкаваліся ў розных выданнях. У 2024 годзе выйшла першая кніга “Особое изделие - стихи”. Жыве ў Лідзе.**



## Людміла Краснадубская

**Нарадзілася 19 снежня 1957 г. у в. Вішнёўка Мінскага раёна. Закончыла Вішнёўскую васьмігадовую і Паперненскую сярэднюю школы, Мар'інагорскі ордэна "Знак Пашаны" саўгас-тэхнікум (1975-1978 гг.). Па прафесіі аграном. Піша песні і вершы, з якімі выступае на сцэне. Друкавалася ў раённых газетах і калектыўных зборніках. Аўтар чатырох кніг паэзіі. Дыпламант XII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур. Першае месца ў Рэспубліканскім конкурсе "Мая Беларусь". Жыве ў Лідзе.**



**Алесь Аляшкевіч (*псеўд.* Алесь Гара)**

**Нарадзіўся 14 ліпеня 1958 г. ў в. Вечаторава, Стаўбцоўскага раёна, скончыў Лідскае музычнае вучылішча (1981), факультэт журналістыкі БДУ (1990). З 1981 года працуе выкладчыкам музыкі ў Новаколасаўскай школе мастацтваў. Выдаў кнігі: "Д'яблава мора", аповесць, апавяданні (1994) пад псеўданімам Алесь Гара; "Чорная дзірка", аповесці, апавяданні (2001) пад псеўданімам Алесь Гара; "Дзеці зорак", аповесці, апавяданні (2009); "Золотые апостолы Радзивилловские", раман, апавяданні (2011); "Замкавая гара", раман (2019); "Крыж княжны Прадславы", аповесці, апавяданні, навелы (2021).**



## Ганна Баборык

**Нарадзілася 7 жніўня 1959 г. у в. Моцевічы Жалудоцкага раёна. Адукацыя вышэйшая, скончыла ў 1980 годзе Мінскі інстытут культуры. Працавала ў аддзелах культуры і ідэалогіі Лідскага райвыканкама. Была салісткай народнага ансамбля народнай музыкі "Гудскі гармонік", аўтар тэкстаў многіх песень, якія выконваюцца ансамблем, аўтар урачыстай песні пра горад Ліду. Друкавалася ў зборніку "Ад лідскіх муроў". Жыве ў Лідзе.**



## Станіслава Белагаловая

**Нарадзілася 25 жніўня 1959 года ў вёсцы Крамушаўка Навагрудскага раёна. Скончыла Налібоцкую сярэднюю школу, вучылася ў Гродзенскім гандлёвым вучылішчы. У 1977 годзе выйшла замуж. Разам з мужам у 1978 годзе пераехала жыць у г. Ліду. Амаль уся працоўная дзейнасць прайшла ў Лідскім гархарчпрамгандлі. Піша вершы. Друкуецца ў мясцовых выданнях. Аўтар зборніка паэзіі “Наедине с душой” (2018). Жыве ў Лідзе.**



## Іосіф Масян

**Нарадзіўся 29 жніўня 1959 г. у в. Апіта Іўеўскага раёна.Закончыў Ліпнішкаўскую СШ таго ж раёна, Лідскі індустрыяльны тэхнікум, журфак БДУ (1994 г.). Друкаваўся ў газетах “Звязда”, “Чырвоная змена”, “Знамя юности”, “Ніва”, у часопісах “Родная прырода”, “Дом і сям'я”, у зборніку “Ад лідскіх муроў” і іншых выданнях. Жыве ў Лідзе.**



## Алесь Сымановіч

**Нарадзіўся 11 сакавіка 1960 года ў горадзе Лідзе. На працягу пятнаццаці гадоў служыў музыкантам штатнага вайсковага аркестра ў Лідскай в/ч № 34154. Працаваў музыкантам, дырыжорам, інструментоўшчыкам, аранжыроўшчыкам у розных установах культуры і адукацыі, рэдактарам шахматнай рубрыкі ў "Лідскай газеце". Кандыдат у майстры спорту па шахматнай кампазіцыі. Друкаваўся ў зборніку "Ад лідскіх муроў". Жыве ў Лідзе.**



## Тарэза Смольская

**Нарадзілася 31 сакавіка 1960 г. у Лідзе. Адпрацавала 25 гадоў на дзяржслужбе на пасадзе галоўнага інспектара. Напісала і апублікавала на вершаваным сайце Stihi.ru 1300 твораў: лірыка грамадзянская і філасофская, рэлігійная і пейзажная, гарадская і любоўная. Друкавалася ў зборніку "Ад лідскіх муроў". Выдала зборнікі вершаў "Мои стихи, как дети", "Миле сна в ночи - моя скупая строчка (2013), "Пусть новые песни о Лиде слагают..." (2024), "Снеговики и зайцы" (2025). Жыве ў Лідзе.**



## Генадзь Зубрыцкі

**(9 чэрвеня 1960 - 13 сакавіка 2007)**

**Нарадзіўся ў Лідзе. Асноўнае захапленне - бардаўская песня. Выпусціў тры альбомы песень на свае вершы і адзін альбом на вершы Леаніда Вінніка. Удзельнік і прызёр фестываляў аўтарскай песні. Памёр у Лідзе і пахаваны на лідскіх могілках “Зосіна”.**



# Галіна Лаўрэш

**Нарадзілася 25 верасня 1960 г. у Лідзе. Адукацыя вышэйшая: інжынер-хімік і эканаміст-бухгалтар. Празаік, перакладчык з польскай мовы. Друкавалася ў зборніку "Ад лідскіх муроў", альманаху "Асоба і час", у газеце "Наша слова". Суаўтар кнігі "Там, дзе спыніўся час" (2024). Жыве ў Лідзе.**



# Юра Карэйва

**(29 мая 1961 - 5 студзеня 2021)**

**Нарадзіўся ў Лідзе. Закончыў СШ № 4 (1978 г.) і філфак Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (1995 г.). Працаваў выкладчыкам у Гродна ў СШ № 26 і 18. Навучаўся пры касцёле Святога Духа ў Вільні, а потым вучыўся ў Маскве. З вершамі выступаў у многіх рэспубліканскіх выданнях. Быў рэдактарам зборнікаў "Ад лідскіх муроў" (№ 4, № 5). Памёр у Лідзе. Пахаваны на лідскіх могілках "Зосіна-2".**



## Міхаіл Баранчык

Нарадзіўся ў горадзе Лідзе 15 лістапада 1961 года. Вучыўся ў Бел. тэхналаг. інстытуце. Друкуецца ў перыядычным друку. Выходзілі падборкі вершаў у “Лідскай газеце”, у часопісах “Мишпоха” (Віцебск), “Приокские зори” (Тула), “Нёман” (Мінск) і інш., у анталогіі сучаснай рускамоўнай паэзіі Беларусі, у альманаху “Кавказский экспресс” (2020, 2021). Аўтар зборнікаў вершаў “Джаз для двоих” (2013, сумесны з піцерскім аўтарам Таццянай Багаевай), “Мои стихи - лишь письма в никуда” (2016), “Четыре времени чувств” (2019). Лаўрэат літаратурнай прэміі імя Сімяона Полацкага (2017). Жыве ў Мінску.



## Уладзіслаў Сосна

**Нарадзіўся 20 мая 1962 года ў в. Вялікае Сяло Шчучынскага раёна. Скончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут. Інжынер. Празаік. Друкаваўся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**



# Сяргей Герасімовіч

**Нарадзіўся 13 снежня 1962 года ў г. Пятроўск-Забайкальскі Чыцінскай вобласці. У 1985 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педінстытут замежных моў (перакладчыцкі факультэт), перакладчык з іспанскай і англійскай моў. Вайсковы перакладчык у 1987-1989 гадах (Народная Рэспубліка Мазамбік). Уваходзіў у склад клуба аўтарскай песні "Ветразь" (г. Мінск) з 1981 па 1985 год. Аўтар песенных альбомаў "Паўднёвы крыж", "Гэта ўвогуле, жыццё..." і зборніка паэзіі "У кальцы Сатурна" (2024 г.). Друкаваўся ў зборніку "Ад лідскіх муроў". З 1991 года працуе ў ЗАТ "Каскад" г. Ліды. Жыве ў Лідзе.**



## Леанід Лаўрэш

**Пісьменнік, сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў з 2018 па 2021 г., незалежны даследчык. Стваральнік і адміністратар аднаго з найстарэйшых беларускіх гістарычных сайтаў “Павет” (з’явіўся ў сецівe ў 1999 г.). Нарадзіўся 1 сакавіка 1963 г. у Лідзе. Скончыў электратэхнічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1985), інжынер. Працуе ў Лідскіх электрасетках. Аўтар звыш 20 уласных кніг, шэрагу перакладных і звыш 300 артыкулаў. Жыве ў Лідзе.**



## Лілея Сазанавец

**Нарадзілася 10 чэрвеня 1963 г. у Іўеўскім раёне. Закончыла Лідскі індустрыяльны тэхнікум (1982), вучылася ў Беларускім тэхналагічным інстытуце (1984-88). Працавала на заводзе “Оптык” (1982-84) і на лакафарбавым заводзе (1990-98). Вучылася на факультэце славістыкі Віленскага педагагічнага ўніверсітэта. Друкавалася з 1996 года, у т.л. у часопісе “Лідскі летапісец” і зборніку “Ад лідскіх муроў”. Выдала кнігу навэл “Неспланаванае забойства” (1996). Жыве ў Канадзе.**



## Рычард Груша

**Нарадзіўся 27 ліпеня 1963 г. у в. Сцеркава Лідскага раёна. Закончыў аддзяленне станковага малюнка і жывапісу Маскоўскага народнага ўніверсітэта мастацтваў. З 1987 г. займаўся афармленнем дзіцячых садкоў. У 1991 г. стварае МП "Дызайн", якое займалася добраўпарадкаваннем горада. Стварыў для Ліды і Беларусі мноства малых скульптурных форм. У 2010 годзе ў Лідзе выдаў альбом песень для голасу ў суправаджэнні фартэпіяна "Беларуская зорка" на ўласныя вершы. Жыве ў Лідзе.**



## Ганна Рэлікоўская

Нарадзілася 8 ліпеня 1964 года ў вёсцы Кянці Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1979 годзе закончыла Кенцеўскую васьмігадовую школу і паступіла ў Ваўкавыскае педвучылішча. У 1983 годзе пачала працаваць настаўніцай пачатковых класаў у СШ № 8 г. Ліды. Закончыла гістфак БДУ у 1991 г., выкладала гісторыю ў школах Ліды.  З 2005 па 2017 год працавала намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 11 г. Ліды. Друкавала вершы ў мясцовых выданнях, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.



# Вольга Верасняк

**Нарадзілася ў г. Бійску, Алтайскага края. Жыве ў Лідзе з 1994 г. Сябар Саюза расійскіх паэтаў, каардынатар па Беларусі ў Міжнароднай асацыяцыі літаратараў “Садружнасць”. Сябар розных літаб’яднанняў. Лаўрэат Міжнародных конкурсаў, з’яўляецца ўладальнікам ганаровых знакаў “Залатое пяро рускай літаратуры” і “Літаратурны фенікс”. Друкуецца ў мясцовых выданнях.**



## Юрась Пацюпа

**Нарадзіўся 13 сакавіка 1965 года ў г. Полацку, маленства прайшло ў в. Дамейкі на Лідчыне, скончыў Азёрскую сярэднюю школу, філалагічны факультэт і аспірантуру ў ГрДУ імя Янкі Купалы, працаваў у музеі-скансэне ў Мінску, выкладчыкам у ГрДУ, рэдактарам у выдавецтве "Мастацкая літаратура", супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі НАН Беларусі. Кандыдат філалагічных навук. Аўтар кніг вершаў “Ноч” (1991), “Сабака” (2009), зборніка артыкулаў “Анонс: Квадрат тэкстаў” (2013). Друкаваўся ў часопісах “Крыніца”, “Arche”, “Дзеяслоў”, “Роднае слова”, “Маладосць”, “Беларускі фальклор”, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Мінску.**



## Уладзімір Клімовіч

**Нарадзіўся 8 жніўня 1967 г. у в. Ігнатаўцы Лідскага раёна. Аўтар кніг “Выратаванне безданню”(1992), “Той, хто будуе горад” (1997), “Лаліта і кактус” (1997). Жыве ў Мексіцы.**



## Антось Савук

**Сапраўднае: Антон Уладзіміравіч Саук,**
**(13 лютага 1968 - 27 кастрычніка 2003)**
**Нарадзіўся ў горадзе Лідзе. Вучыўся спачатку ў Шайбакоўскай базавай школе, а з 1983 па 1985 год - у СШ № 1 г. Ліды. У 1986 годзе паступіў ў Беларускі політэхнічны інстытут на будаўнічы факультэт і па заканчэнні атрымаў кваліфікацыю інжынера-эканаміста. Працаваў майстрам у БУ-104, УМСР-163, прарабам у БУ-103, УМСР-163, ААТ БМТ № 19 г. Ліды. Надрукаваў у часопісе "Лідскі летапісец" 15 артыкулаў. Памёр у Лідзе. Пахаваны ў Жырмунах Воранаўскага раёна.**



## Аліна Сабуць

**Літаратуразнаўца, літаратурны крытык. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Янкі Купалы. Даследчык гісторыі беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў.**
**Нарадзілася ў 1969 годзе ў в. Навасёлкі Лідскага раёна ў сям'і настаўнікаў. Закончыла Лідскае педвучылішча (1987), ГрДУ імя Янкі Купалы (1992), аспірантуру Інстытута літаратуры НАН Беларусі (1997). Аўтар звыш 200 літаратуразнаўчых публікацый у рэспубліканскім і замежным друку. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь (2023) у намінацыі "Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства". Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Жыве ў Гродна.**



## Ганна Камінская

**Нарадзілася 3 лютага 1971 г. у в. Клюкавічы Лідскага раёна. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны медінстытут у 1996 г. З 1997 г. працуе ва ўстановах аховы здароўя "Лідскага ТМА". Спецыялізацыя - хірург па аказанні экстраннай дапамогі. Піша вершы, друкуецца ў перыядычных выданнях, у т.л. у зборніку "Ад лідскіх муроў". Жыве ў Лідзе.**



## Жанна Сянкевіч

**Нарадзілася 12 сакавіка 1972 года. Закончыла лідскую СШ № 4 з музычным ухілам. Пазней атрымала спецыяльнасць лабаранта-хіміка бактэрыялагічнага аналізу. 26 гадоў адпрацавала на Лідскім малочна-кансервавым камбінаце. На працягу 15 год з'яўлялася салісткай народнага ансамбля польскай песні “Крэсавяцы”. Паэтэса. Друкавалася ў зборніку “Ад лідскіх мурoў”. Жыве ў Лідзе.**



## Вольга Ашмяна-Бічэль

**Нарадзілася 2 красавіка 1973 года ў горадзе Лідзе. Закончыла Лідскае педвучылішча ў 1992 годзе, пасля вучылася ў ГрДУ імя Янкі Купалы. Працавала ў Дакудаўскай сярэдняй школе настаўніцай пачатковых класаў. Піша вершы. Друкуецца ў мясцовых выданнях, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**



## Лілея Петрусевіч

**Нарадзілася 11 мая 1974 года ў вёсцы Ваверцы Лідскага раёна. Закончыла Ваверскую сярэднюю школу, вучылася ў Лідскім педвучылішчы, у 1998 годзе закончыла ГрДУ імя Янкі Купалы (кваліфікацыя “Настаўнік пачатковых класаў”). Працуе настаўнікам і педагогам дадатковай адукацыі па сумяшчальніцтве, вядзе заняткі аб'яднанняў па інтарэсах “Калаўрот”, “Юныя экскурсаводы” ў Ваверскай сярэдняй школе Лідскага раёна. Вершы друкуюцца ў “Лідскай газеце”. Жыве ў Ваверцы.**



## Наталля Анашкевіч

**Нарадзілася 24 лютага 1977 года ў г. Лідзе. У 1994 годзе закончыла Ганчарскую сярэднюю школу Лідскага раёна. З 1994 па 1999 год вучылася на філалагічным факультэце БДУ (г. Мінск). Са жніўня 1999 года працуе настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў СШ № 11 г. Ліды. З 2008 года займаецца даследчай краязнаўчай дзейнасцю. Аўтар звыш 30 даследчых прац. Сябра літаб'яднання "Суквецце". Друкуецца ў перыядычных выданнях. Аўтар трох краязнаўчых кніг. Укладальнік кнігі "Паэтычнае суквецце Лідчыны" (2025 г.). Жыве ў Лідзе.**



## Алесь Нічыпар

**Нарадзіўся 22 студзеня 1978 года ў Лідзе. Фельчар. Служыў па кантракце ў памежных войсках. Працаваў на станцыі “Хуткай дапамогі”. Напісаў некалькі апавяданняў і аповесцяў. Друкаваўся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. У 2005 годзе выдаў кнігу “Паўночная песня”. Асноўная тэма творчасці - ранняе Сярэднявечча, вікінгі. Жыве ў Лідзе.**



## Васіліса Пазнухова

**Нарадзілася 24 красавіка 1979 г. ў г. п. Пагранічны Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла там сярэднюю школу і музычную школу па класе фартэпіяна. У 2001 г. закончыла ГрДУ імя Янкі Купалы (выкладчык польскай і беларускай мовы і літаратуры, кіраўнік харавой фальклорнай групы). Закончыла магістратуру ГрДУ. Працавала ў розных установах адукацыі і культуры Лідскага раёна. З 3 гадоў піша вершы і прозу. Друкуецца ў мясцовых і рэспубліканскіх выданнях. Выдала зборнік "Мілавіца" (2006).**



# Протаіерэй Расціслаў Салаўёў,

## кандыдат багаслоўя, магістр гістарычных навук

**Нарадзіўся 25 жніўня 1979 г. у г.п. Наваельня Дзятлаўскага раёна. Закончыў Мінскую Духоўную акадэмію (2007), ГрДУ (2024). Настаяцель Свята-Барыса-Глебскага храма в. Накрышкі Дзятлаўскага раёна (2003 - 2007). Настаяцель прыходу храма святога Вялікапакутніка Георгія Пераможца ў г. Лідзе (з 2007). Дабрачынны Лідскай царкоўнай акругі (з 2010). Аўтар прац па гісторыі Праваслаўнай Царквы. Адзін з аўтараў кнігі “Сия есть победа, победившая мир, вера наша: Православие на Лидчине в XIII - начале XXI века”. Жыве ў Лідзе.**



## Яўген Лянцэвіч

**Нарадзіўся ў 1980 годзе ў в. Закальное Мінскай вобласці. У 2006 годзе скончыў ГрДУ імя Янкі Купалы. Працуе дазнавальнікам у Лідскім РАУС. Друкаваўся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**



## Наталля Танanушка

**Нарадзілася 4 лістапада 1981 года ў Лідзе. Адукацыю атрымала ў Гімназіі № 1 г. Ліды, Мінскім дзяржаўным гандлёвым каледжы (юрысконсульт) і на аддзяленні алігафрэнапедагогікі і лагапедыі БДПУімя Максіма Танка (настаўнік-дэфектолаг), зараз - лагапед-дэфектолаг вышэйшай катэгорыіі ў адным з дзіцячых садкоў г. Ліды. З'яўлялася адным з арганізатараў і вядоўцам курсаў “Мова Нанова” ў Лідзе. Друкавалася ў газеце “Наша слова”, у “Лідскай газеце”, зборніку “Ад лідскіх муроў”. Лаўрэат прэміі імя Веры Навіцкай. Жыве ў Лідзе.**



## Алесь Мацулевіч

**(19 студзеня 1981 - 2 снежня 2023)**

**Нарадзіўся ў Лідзе. Закончыў Лідскае педвучылішча (2000), БрДУ імя А. С. Пушкіна (2005, філалагічны факультэт). Працаваў у рэдакцыі “Лідскай газеты”. Вершы друкаваліся ў “Лідскай газеце”, у літаратурна-мастацкіх часопісах “Ад лідскіх муроў” і “Верасень”, у калектыўных зборніках. (2018). Аўтар кніг паэзіі “Леў і ключы” (2015), “Горад-карабель” (2019), “Бронзавы Гедымін” (2024, пасмяротна). З 2019 года быў кіраўніком літаб'яднання “Суквецце”. Лаўрэат прэміі імя Веры Навіцкай. Пахаваны на могілках в. Цябы Лідскага раёна.**



# Кацярына Янчэўская

**Нарадзілася 27 чэрвеня 1981 года ў Лідзе. Паэтэса, мастацтвазнаўца, філосаф. Вершы друкаваліся ў зборніку “Ад лідскіх муроў”, у газетах “Літаратура і мастацтва”, “Лідская газета”, часопісах “Маладосць”, “Дзеяслоў”, “Тэрмапілы”. Аўтар кнігі паэзіі “Белае шматкроп'е” (2021). Жыве ў Лідзе.**



# Алесь Хітрун

**Нарадзіўся 17 жніўня 1982 г. у вёсцы Крупава Лідскага раёна. Закончыў Крупаўскую СШ, Лідскае ПТВ-196, музычную школу (клас баяна), завочна - філфак ГрДУ імя Янкі Купалы (выкладчык беларускай мовы і літаратуры). Працуе ў Лідскім гісторыка-мастацкім музеі навуковым супрацоўнікам літаратурнага аддзела “Дом Валянціна Таўлая”. Быў кіраўнікам літаб'яднання “Суквецце” пры рэдакцыі “Лідскай газеты” (са студзеня 2012 па люты 2019). Друкуецца ў рэспубліканскіх і мясцовых перыядычных выданнях, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. Лаўрэат Міжнароднага конкурсу паэзіі і паэтычнага перакладу “Берега дружбы” (Расія, 2017). Жыве ў Лідзе.**



# Ксёндз канонік Юрый Бяганскі

**Нарадзіўся 1 лютага 1983 г. у в. Кемяны Шчучынскага раёна, там жа закончыў базавую школу, а затым Астрынскую СШ (1999 - 2001). Паступіў у духоўную семінарыю ў 2001, закончыў у 2007 г. Атрымаў ступень магістра і прыняў святарскае асвячэнне ў 2007 г. Быў вікарыятам (2007-2008) Радунскага дэканата. Затым з 2008-2018 гг. служыў у лідскіх каталіцкіх парафіях. У 2013 г. навучаўся ў Люблінскім каталіцкім універсітэце. У 2019 г. атрымаў ступень доктара тэалогіі. У 2018 - 2025 гг. - быў пробашчам і кусташам санктуарыя ў Тракелях. У 2022 годзе атрымаў тытул канонiка. З 2025 г.  пробашч парафій Найсвяцейшай Тройцы (Войстам) і Перамянення Пана (Данюшава). Аўтар пяці кніг рэлігійнай тэматыкі, а таксама краязнаўчай кнігі “Мінулае і сучаснае Дворышча”.**



**Кастусь Якубчык**

**Нарадзіўся 4 красавіка 1983 года, працуе ў лакаматыўным дэпо Ліда слесарам па рамонце рухомага саставу. Піша вершы, галоўным чынам для дзяцей. Творы паэта змяшчаюцца ў “Лідскай газеце”, у зборніку “Ад лідскіх муроў”, у дзіцячых часопісах “Вясёлка”, “Буся”, “Пралеска”. Лаўрэат адкрытага рэгіянальнага конкурсу імя Веры Навіцкай “Дарослыя - дзецям” і прафсаюзнага фестывалю-конкурсу Баранавіцкага аддзялення Беларускай чыгункі “Сузор’е талентаў”. Жыве ў Лідзе.**



## Валера Мацулевіч

Нарадзіўся 4 жніўня 1983 года ў Лідзе. Скончыў Навагрудскі гандлёва-эканамічны тэхнікум па спецыяльнасці “Бухгалтарскі ўлік і аўдыт”. Працаваў на лідскіх прадпрыемствах, у школе № 8 г. Ліды. Друкаваўся ў газетах “Лідская газета”, “Принёманские вести”, “Гродзенская праўда”, літаратурна-мастацкіх часопісах “Ад лідскіх муроў”, “Нёман”, “Маладосць”. Аўтар зборнікаў паэзіі “Струны душы” (2011) і “Чалавек са свечкай” (2014). Жыве ў Лідзе.



## Ларыса Лайкевіч

**Нарадзілася 10 лютага 1984 года ў пасёлку Забалаць Воранаўскага раёна. Закончыла Лідскае педагагічнае вучылішча, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Пушкіна (гістарычны факультэт). Закончыла магістратуру. Працуе настаўніцай пачатковых класаў у СШ № 12 горада Ліды. Піша вершы. Друкавалася ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**



## Ганна Шаўчэнка (Серэхан)

**Нарадзілася 1 кастрычніка 1984 г. у мястэчку Астрына на Гродзеншчыне. Дзяцінства і юнацтва правяла ў вёсцы Ганчары Лідскага раёна, дзе атрымала сярэднюю адукацыю. Скончыла філфак БДУ (2007), магістратуру (2008) і аспірантуру (2012) пры ім. Літаратуразнаўца, перакладчыца, паэтка. Аўтар манаграфіі “Паэзія Антона Гарэцкага і станаўленне рамантычнай традыцыі ў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя”, кніг вершаў “Запаветная жменька” (2007), “Пане, будзь заўжды са мной: Вершаваныя малітвы для дзяцей” (2010), публікацый, прысвечаных даследаванню польскамоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. Працуе ў выдавецтве “Pro Christo”, супрацоўнік рэдакцый часопісаў “Наша вера” і “Ave Maria”. Жыве ў Мінску.**



## Уладзімір Глінін

Нарадзіўся ў Лідзе 25 лістапада 1984 года. Закончыў СШ № 1 г. Ліды. У 2002 годзе паступіў у Мірскае мастацкае вучылішча, пасля заканчэння ў 2004 годзе атрымаў прафесію столяра, разьбяра па дрэве. З 2004 па 2006 год праходзіў службу ва Узброеных Сілах Беларусі. З 2011 года працуе інжынерам на Лідскім тэлебачанні. З 2024 года кіраўнік літаратурнага аб'яднання “Суквецце” пры рэдакцыі “Лідскай газеты”. Вершы публікаваліся на старонках “Лідскай газеты”, апавяданні друкаваліся ў часопісе “Домашний”. Жыве ў Лідзе.



## Аляксей Сымановіч

**Нарадзіўся 10 мая 1985 года ў Лідзе. Закончыў Гімназію № 1 г. Ліды, ГрДУ імя Янкі Купалы. Філолаг, настаўнік рускай мовы і літаратуры, мастацтва. Настаўнік-метадыст. Магістр філалагічных навук. Лаўрэат юбілейнага X Міжнароднага Пушкінскага конкурсу (г. Масква). Лаўрэат II абласнога фестывалю “Паэзія - душы рух”. Аўтар зборнікаў вершаў “12 ісцін”, “25 крокаў да Дэкадансу”, “Методыка 25-га кадра”. Жыве ў Лідзе.**



# Святлана Курловіч

**Нарадзілася ў лютым 1986 года ў Лідзе. Скончыла сярэднюю школу № 15 г. Ліды, а затым Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут (факультэт “Міжнародныя адносіны”). Атрымала спецыяльнасць “Рэферэнт-перакладчык з англійскай і французскай моў”. Друкавалася ў зборніках “От сердца к сердцу”, “Ад лідскіх муроў”, у газетах “Лідская газета” і “Принеманские вести”. Жыве ў Маскве.**



## Вольга Сідарака

**Нарадзілася 14 студзеня 1987 года ў горадзе Сянно Віцебскай вобласці. У 1997 годзе з сям'ёй пераехала ў Ліду. Вучылася ў СШ № 6 і № 14 г. Ліды. У 2006 годзе скончыла Лідскі педагагічны каледж. Скончыла Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, факультэта псіхалогіі. Піша вершы. Друкавалася ў зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў горадзе Лідзе.**



## Кацярына Гоман

Нарадзілася 20 снежня 1988 года ў горадзе Лідзе. Скончыла БДУКМ у 2014 годзе па спецыяльнасці "мастацтва эстрады, інструментальная музыка". Настаўніца па фартэпіяна, канцэртмайстар. Спявачка, фіналістка розных тэлепраектаў, дыпламантка і лаўрэатка мноства конкурсаў, вакальных фестываляў, дзейная салістка яўрэйскага ансамбля "Шалом" г. Ліды. Захапляецца паэзіяй. Друкавалася ў "Лідскай газеце", у зборніку "Ад лідскіх муроў". Жыве ў Мінску.



**Вольга Цяслюк**

**Нарадзілася 4 студзеня 1989 года ў Лідзе, скончыла СШ № 17 г. Ліды, БДУ па спецыяльнасці “Журналістыка”. Друкавалася ў “Лідскай газеце”, “Принёманских вестях”, у зборніках “Шануйце роднае слова!”, “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Мінску.**



# Юльян Місюкевіч

**Нарадзіўся ў кастрычніку 1989 г. у Лідзе. Вучыўся ў сярэдняй школе № 10 г. Ліды, закончыў музычную школу па класе кларнета і Гімназію № 1 г. Ліды, фізфак БДУ. Празаік. Друкаваўся ў “Лідскай газеце”, “Гродзенскай праўдзе”, у зборніку “Ад лідскіх мuроў”, у газетах “Новы час” і “Літаратура і мастацтва”. Аўтар кнігі апавяданняў “Скрозь туманнасць”. Жыве ў Мінску.**



## Алеся Якубоўская

**Нарадзілася 20 красавіка 1990 года ў горадзе Лідзе. Скончыла БДЭУ. Друкавалася ў зборніку “Ад лідскіх муроў”.**



## Кірыл Сыцько

**Нарадзіўся ў 1990 г. у Лідзе. Скончыў Лідскі каледж, БДУ. Кандыдат гістарычных навук. Працуе ў Навуковай бібліятэцы НАН Беларусі. Аўтар шэрагу навуковых прац. Піша вершы. Друкаваўся ў "Нашым слове", "Маладосці", у зборніках "Шануйце роднае слова", "Ад лідскіх муроў". Жыве ў Мінску.**



## Алена Сіманчык

**Нарадзілася 18 чэрвеня 1991 года ў вёсцы Мажэйкава Лідскага раёна. У 2013 годзе скончыла БДПУ імя М. Танка, факультэт спецыяльнай адукацыі: спецыяльнасць - алігафрэнапедагог; настаўнік-лагапед. Працуе па сваёй спецыяльнасці ў сярэдняй школе № 15 г. Ліды. Піша ў большасці вершы, час ад часу - невялікія апавяданні. Жыве ў Лідзе.**



## Гражына Хруль

Нарадзілася 4 верасня 1992 г. у горадзе Лідзе. Вершы пачала пісаць з 2008 года. Друкавалася ў “Лідскай газеце”,  у зборніках “Ад лідскіх муроў”, “Шануйце роднае слова!”



# Марыя Завала

**Нарадзілася 5 лістапада 2013 года ў Лідзе. Вучыцца ў СШ № 4 г. Ліды. Пачала складаць невялікія вершы ў другім класе. Займаецца вакалам, з'яўляецца удзельніцай узорнага хору “Аніма”. Друкавалася ў “Лідскай газеце, у зборніку “Ад лідскіх муроў”. Жыве ў Лідзе.**

ЗМЕСТ

Літаратурны чын Лідчыны - 5
I. Ян Карцан
II. Міхал Карыцкі
III. Мацей Догель
IV. Казімір Даніэль Нарбут
V. Станіслаў Баніфацы Юндзіл
VI. Аляксандра Нарбут
VII. Графіня Ганна Патоцкая
VIII. Тэадор Остык Нарбут герба Трубы
IX. Антоні Гарэцкі
X. Графіня Сафія дэ Шуазёль Гуф'е
XI. Ігнат Дамейка
XII. Каміла Юрэвіч з Нарбутаў
XIII. Мірон Браніслаў Нарбут
XIV. Канстанцін Кашыц
XV. Альжбета Табенская
XVI. Вільгельм Пратасевіч
XVII. Апалонія Серакоўская з Далеўскіх
XVIII. Тэадора Манчунская з Нарбутаў
XIX. Аляксандр Дамбавецкі
XX. Вандалін Шукевіч
XX1. Кіпрыян Кандратовіч
XXII. Амелія Даравінская (Дзеравінская), "Бірута"
XXIII. Карусь Каганец
XXIV. Уладзіслаў Вярыга
XXV. Амброзі Кастравіцкі
XXVI. Уладзіслаў Котвіч
XXVII. Вера Навіцкая
XXVIII. Алаіза Пашкевіч (Цётка)
XXIX. Міхал Шымялевіч
XXX. Антон Грымайла-Прыбытка
XXXI. Алена Іваноўская
XXXII. Каміла Эмілія Макрэцкая
XXXIII. Аляксандр Снежка
XXXIV. Іосіф Далінскі
XXXV. Графіня Эльжбета Красіцкая
XXXVI. Вітольд Пілецкі
XXXVII. Гарасім Прамень
XXXVIII. Уладзіслаў Абрамовіч
XXXIX. Пятрусь Граніт
XL. Уладзімір Корбан
XLI. Ежы Путрамант
XLII. Аркадзь Мігдал
XLIII. Якуб Міско
XLIV. Пятро Бітэль
XLV. Валянцін Таўлай
XLXI. Васіль Струмень
XLVII. Ніна Тарас
XLVIII. Міхась Белавокі
XLIX. Антоні Масьлінскі
L. Вера Ляцецкая
LI. Уладзімір Урбановіч
LII. Земавіт Фядэцкі
LIII. Мікалай Дзікевіч
LIV. Іосіф Кардаш
LV. Іван Саўко
LVI. Мікалай Лазоўскі
LVII. Пётр Калбыка
LVIII. Анатоль Кулеш
LIX. Віктар Каваленка
LX. Уладзімір Дронаў
LXI. Ірэна Стасевіч-Ясюкова

**LXII. Алеся Бурак**
**LXIII. Уладзімір Сарока**
**LXIV. Уладзімір Логаш**
**LXV. Смарагд Сліўко**
**LXVI. Фёдар Кардаш**
**LXVII. Мікалай Дзелянкоўскі**
**LXVIII. Мар'ян Баяровіч**
**LXIX. Аляксандр Жалкоўскі**
**LXX. Наталля Чакліна-Гарбачова**
**LXXI. Таццяна Сямёнава**
**LXXII. Сымон Лапата**
**LXXIII. Уладзімір Васько**
**LXXIV. Данута Бічэль**
**LXXV. Мікалай Герасімовіч**
**LXXVI. Генаэфа Міхаловіч**
**LXXVII. Пятро Макарэвіч**
**LXXIII. Алесь Стадуб**
**LXXIX. Святлана Цішук**
**LXXX. Уладзімір Мельнікаў**
**LXXXI. Леанід Казачэўскі**
**LXXXII. Юзэфа Данілевіч**
**LXXXIII. Валер Санько**
**LXXXIV. Кастусь Тарасаў**
**LXXXV. Ірэна Сліўко**
**LXXXVI. Віктар ІКудла**
**LXXXVII. Іван Русецкі**
**LXXXVIII. Валерый Сліўкін**
**LXXXIX. Ганна Гайдукевіч**
**XC. Леапольд Пырскі**
**XCI. Рычард Смольскі**
**XCII. Людміла Русь**
**XCIII. Ларыса Канчэўская**
**XCIV. Лізавета Палеес**
**XCV. Анастасія Каладзяжная**
**XCVI. Антон Піліпчык**
**XCVII. Уладзімір Янцэвіч**
**XCVIII. Марыя Ганчар**
**XCIX. Міхась Мельнік**
**C. Віктар Бачароў**
**CI. Аркадзь Дзвілянскі**
**CII. Людміла Шот**
**CIII. Іван Гушчынскі**
**CIV. Аляксандр Юрэвіч**
**CV. Ларыса Кавалеўская**
**CVI. Уладзімір Нікулін**
**CVII. Тадэвуш Чарнавус**
**CVIII. Раман Кіман**
**CIX. Станіслаў Суднік**
**CX. Ірына Маркевіч**
**CXI. Ірына Бараздзіна**
**CXII. Анатоль Крупа**
**CXIII. Віктар Праўдзін**
**CXIV. Ала Юшко**
**CXV. Міхаіл Ёрш**
**CXVI. Крысціна Лялько**
**CXVII. Ірына Багдановіч**
**CVIII. Леанід Віннік**
**CXIX. Дмітрый Гуліцкі**
**CXX. Уладзімір Бурак**
**CXXI. Іосіф Кліз**
**CXXII. Марыя Масла**
**CXXIII. Алена Несцерава**
**CXXIV. Людміла Краснадубская**
**CXXV. Алесь Аляшкевіч**

CXXVI.  Ганна Баборык
CXXVII. Станіслава Белагаловая
CXXVIII. Іосіф Масян
CXXIX. Алесь Сымановіч
CXXX. Тарэза Смольская
CXXXI. Генадзь Зубрыцкі
CXXXII. Галіна Лаўрэш
CXXXIII. Юра Карэйва
CXXXIV. Міхаіл Баранчык
CXXXV. Уладзіслаў Сосна
CXXXVI. Сяргей Герасімовіч
CXXXVII. Леанід Лаўрэш
CXXXVIII. Лілея Сазанавец
CXXXIX. Рычард Груша
CXL. Ганна Рэлікоўская
CXLI. Вольга Верасняк
CXLII. Юры Пацюпа
CXLIII. Уладзімір Клімовіч
CXLIV. Антось Савук
CXLV. Аліна Сабуць
CXLVI.  Ганна Камінская
CXLVII. Жанна Сянкевіч
CXLVIII Вольга Ашмяна-Бічэль
CXLIX. Лілея Петрусевіч
CL. Наталля Анашкевіч
CLI. Алесь Нічыпар
CLII. Васіліса Пазнухова
CLIII. Расціслаў Салаўёў
CLIV. Яўген Лянцэвіч
CLV. Наталля Тананушка
CLVI. Алесь Мацулевіч
CLVII. Кацярына Янчэўская
CLVIII. Алесь Хітрун
CLIX. Юрый Бяганскі
CLX. Кастусь Якубчык
CLXI. Валера Мацулевіч
CLXII. Ларыса Лайкевіч
CLXIII. Ганна Шаўчэнка
CLIV. Уладзімір Глінін
CLXV. Аляксей Сымановіч
CLXVI. Святлана Курловіч
CLXVII.  Вольга Сідарака
CLXVIII Кацярына Гоман
CLIX. Вольга Цяслюк
CLXX. Юльян Місюкевіч
CLXXI. Алеся Якубоўская
CLXXII. Кірыл Сыцько
CLXXIII. Алена Сіманчык
CLXXIV. Гражына Хруль
CLXXV. Марыя Завала

**ЛІДСКІ ПАРНАС.175 партрэтаў лідскіх літаратараў.** - Ліда: Лідскі гісторыка-мастацкі музей, ПУП "Пружмень", 2025. - 10 с.: CLXXV іл.
Наклад абмежаваны. Надрукавана на ўласным абсталяванні Лідскага гісторыка-мастацкага музея.
Папера офісная. Фармат А-3. Друк кампутарны. Гарнітура “Таймс”. Пераплёт - Лідская друкарня.